ДЗЕДЗІЧ
Зберагчы і памяльніцы
ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ
# ДЗЕДЗІЧ
*Для Бацькаўшчыны-маці буду йграць.*
*(Янка КУПАЛА)*
№ 1 (26)
ЛЮТЫ 2004

2 А ТЫ ЗАПІСАЎСЯ Ў ДАБРАВОЛЬЦЫ?!
6 СЛОВЫ-СТРАШЫЛКІ
4 СУСВЕТНЫ ТУР ЗАБОЙЦЫ
Навошта Лі Харві Освальд прыязджаў у Менск
8 КРУЦІ НЕ КРУЦІ...
Чарговы наступ на беларушчыну

# СТРАХ

**СТРАХ СТАНОВИТСЯ ПОСТОЯННЫМ СПУТНИКОМ НАШЕЙ ЖИЗНИ. ЖЕЛАЕМ МЫ ТОГО ИЛИ НЕТ, НО ЭТОТ СТРАХ НЕ ПЛОД БОЛЬНОГО ВООБРАЖЕНИЯ. ОН РЕАЛЕН И ОН ВЕЗДЕ. САМЫЕ СТРАШНЫЕ ПОСЛЕДСТВИЯ ЗАПОЛОНИВШЕГО НАШУ ЖИЗНЬ СТРАХА – ЭТО ЖИЗНЬ, ПРЕВРАТИВШАЯСЯ ДЛЯ ПОДАВЛЯЮЩЕГО ИЗ НАС БОЛЬШИНСТВА В ЭЛЕМЕНТАРНОЕ ВЫЖИВАНИЕ. МЫ ВДАЛБЛИВАЕМ В ГОЛОВЫ СВОИХ ДЕТЕЙ НЕ СОЗНАНИЕ ИХ ЧЕЛОВЕЧЕСКОГО ДОСТОИНСТВА, А ЧУВСТВО СТРАХА.**



Фота: ByMedia.net

Ребёнок идёт в школу, и мы учим его: не спорь с учителем, даже если учитель не прав, подумай об оценках, будь умнее, уступи, промолчи. Ребёнок идёт на улицу, и мы снова учим его с наступлением темноты сидеть дома. И снова приводим примеры из реальной жизни, рассказывая, как кого-то убили, ограбили, избили или изнасиловали. Сидя у экранов телевизора, наши дети постигают другие истины: с богатым не судись, с сильным не борись. Понятия «крыша», «взятка», «связи», «откат» известны всем: от школьника до пенсионера. Так называемая «борьба с коррумпированными чиновниками» показывает всесилие, безнаказанность и материальную обеспеченность именно этой категории граждан. С понятием «честный труд на производстве», как правило, ассоциируются нищета и бесправие. Нормальная квартира, автомобиль (а не металлолом 10-15 летней давности), нормальная заработная плата, полноценное питание, возможность летом отдохнуть с семьёй – всё это сегодня атрибуты чиновника любого уровня или крышованных госчиновниками «бизнесменов».

Дети видят, как родители боятся потерять работу, и как живут чиновники, ежедневно рапортующие президенту о достижениях во всех областях нашей экономики. По телевидению дети видят на совещании у президента взрослых, образованных дядей солидного возраста, которых президент отчитывает как мальчишек, не стесняясь в выражениях. И эти дяди не просто сидят, потупив головы – они молчат. Заметно, что они охвачены страхом перед потерей работы и того безбедного уровня жизни, который им дарован за молчание и покорность.

В материале «Заговор молчания», посвящённом теме известных белорусских политиков, пропавших без вести (опубликован на сайте "Хартии '97" – www.charter97.org), Игорь Свободин, давая оценку окружающей нас действительности, пишет:

«А как относится к этой теме общество? Та его, большая часть, которая не знакома с родственниками пропавших, которая не участвует в акциях оппозиции, которая просто живет в стране, где пропадают политические оппоненты власти? Самое распространенное – это равнодушие. В худшем случае – нежелание слышать об этой проблеме, вплоть до агрессивности в отношении к тем, кто ее поднимает».

Я не согласен с таким суждением автора. Наши люди не стали черствее или безразличнее к чужой боли, унижениям и страданиям. Это не результат безразличия – это результат насаждаемого в нашей повседневной жизни страха. В одном из материалов Ирина Красовская рассказывает о своей жизни: «Мои соседи боятся открыто говорить в моей квартире и пишут записки». Я всматриваюсь в лицо этой умной и мужественной женщины. Как много боли и страдания в этих глазах! Как много пережил этот человек, и с ужасом понимаю, что, несмотря на всё богатство и многообразие русского языка, все попытки передать то, что пережила эта женщина, будут лишь жалким подобием того, что выстрадали её разум, сердце, душа.

Я не знаю, как можно описать эту боль и страдания. Мне только хочется верить и надеяться, что у этого насаждаемого в нашей жизни страха будет свой логический конец.

Он должен быть, и он будет!

**В. ГРАЧ, www.charter97.org**

## ШАНОЎНЫЯ БЕРАСЦЕЙЦЫ!

**– Калі Вы падзяляеце нашыя погляды на сучасную сітуацыю ў Беларусі і нашыя надзеі на будучыню,**

**– калі Вы жадаеце супрацоўнічаць з намі, стаць сябрамі "Сузор'я" ці проста перадаць цікавую інфармацыю,**

**паведамляем, што звязацца з намі можна праз распаўсюджвальнікаў нашай газеты, альбо па тэл.: 20-57-41 з $18^{00}$ да $21^{00}$.**
**Маб.: (029) 660-57-41, (029) 725-15-39.**

## МЫ ЧАКАЕМ ВАС!

**Будзем удзячныя таксама за канструктыўныя заўвагі і прапановы.**

**Прэс-служба БАМГА "Сузор'е"**

## АДНЫМ РАДКОМ

### НАВІНЫ МОЛАДЗЕВЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ – У ЭЛЕКТРОННАЙ РАССЫЛЦЫ

Фонд "Дзедзіч" распачаў выпуск электроннай рассылкі Dzedzich week-news з навінамі жыцця моладзевых арганізацый (МА) Берасцейшчыны. Таксама ў рассылцы змяшчаецца інфармацыя аб адукацыйных праграмах, семінарах, аб'явы аб конкурсах праектаў і стыпендый і, безумоўна, крыху гумару.

Рассылка будзе штотыднёвай, але чым больш будзе навін, тым часцей яна будзе выходзіць. Просім усе МА дасылаць нам інфармацыю пра свае мерапрыемствы – былыя і плануемыя.

Падпісацца на рассылку можа любы жадаючы. Трэба толькі даслаць ліст на адрас: dzedzich@mail.ru.

**Dzedzich week-news**

### НЕ – РОСТУ КАМУНАЛЬНЫХ ТАРЫФАЎ

Партыя камуністаў Беларуская пры падтрымцы Народнай кааліцыі «Пяцёрка плюс» правяла ў нядзелю, 22 лютага, на стадыёне «Будаўнік» пікет пад такой назвай.




Негледзячы на зімовае надвор'е і пранізлівы вецер на пікеце прысутнічала каля 100 чалавек. Людзі выказвалі незадаволенасць пастаянным ростам камунальных плацяжоў, зніжэннем узроўня жыцця працоўных. Падчас пікету было сабрана каля 70-ці подпісаў пад зваротам да прэзідэнта А.Лукашэнкі з патрабаваннем спыніць рост цэн і тарыфаў. «Сусветным цэнам – сусветныя заробкі» – пад такім бясспрэчным з пункту гледжання логікі заклікам можа падпісацца любы разумны берасцеец.

Па словах аднаго з арганізатараў пікета, сп. М.Шыкелі, акцыя па збору подпісаў пад зваротам да прэзідэнта працягваецца ўжо некалькі месяцаў:

– Мы ходзім па кватэрах грамадзян, і за гэты час сабралі ўжо больш за 2000 подпісаў, – кажа сп. Шыкеля. – Мы накіроўваем іх асабіста сп. А.Лукашэнку, і будзем чакаць яго адказу. А калі нашы патрабаванні не будуць выкананыя, гэта дазволіць нам праінфармаваць берасцейцаў, што клопат аб простым чалавеку, які дэкларуе сённяшняя ўлада, не больш, чым пусты гук.

Наступным крокам апазіцыйных партый, аб'яднаных у кааліцыю «5+» у Берасці стане мітынг, які плануецца правесці 27 сакавіка. Прымеркаваны да чарговай гадавіны Дня Волі (25 сакавіка), ён працягне ланцуг акцый, скіраваных на азнаямленне грамадства з рэальнай альтэрнатывай існуючай уладзе, здольнай узяць на сябе кіраванне краінай. Чакаецца, што на мітынгу выступяць лідэры дэмакратычных партый Вінцук Вячорка, Станіслаў Шушкевіч, А. Лябедзька і інш.

**Dzedzich week-news**

**Шаноўныя сябры!**

**Рэдакцыя "Дзедзіча" з задавальненнем прыме ад Вас бясплатныя прыватныя аб'явы ў наступны нумар бюлетэня, якія пабачыць свет у сярэдзіне сакавіка 2004 г.**

**Звяртайцеся па тэл.: (0162) 20-57-41 да 10.03.04.**

# А ТЫ ЗАПІСАЎСЯ?..

**У ЛІСТАПАДЗЕ МІНУЛАГА ГОДА "ДЗЕДЗІЧ" ПРАВЁЎ АПЫТАННЕ СТУДЭНТАЎ БрДУ, КАБ ВЫСВЯТЛІЦЬ ІХ СТАЎЛЕННЕ ДА ДЗЕЙНАСЦІ МОЛАДЗЕВЫХ НЕДЗЯРЖАЎНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ (НДА). ПАВЯЛІЧЫЦЬ ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ ДЗЕЙНАСЦІ МОЛАДЗЕВЫХ НДА, НАБЛІЗІЦЬ ІХ ДА РЭАЛЬНЫХ ПАТРЭБ МОЛАДЗІ – ТАКІЯ ЗАДАЧЫ СТАВЯЦЬ СЁННЯ ЛІДАРЫ, ЯКІЯ ІМКНУЦЦА РАЗВІВАЦЬ МОЛАДЗЕВЫ РУХ НА БЕЛАРУСІ. І ГЭТАЕ АПЫТАННЕ ДАЗВОЛІЦЬ НАМ БОЛЬШ УПЭЎНЕНА ФАРМАВАЦЬ СТРАТЭГІЮ СВАЁЙ ДЗЕЙНАСЦІ. УДЗЕЛ У АПЫТАННІ БРАЛІ 255 СТУДЭНТАЎ З БОЛЬШАСЦІ ФАКУЛЬТЭТАЎ.**

Галоўная выснова апытання: студэнты маюць вельмі павярхоўнае ўяўленне аб сэнсе дзейнасці моладзевых НДА і слаба ўдзельнічаюць у іх дзейнасці (сваё сяброўства ў моладзевых НДА пазначылі толькі 18% апытаных – у асноўным – БРСМ).

Прычынамі свайго няўдзелу ў дзейнасці НДА студэнты часцей за ўсё вызначалі **недахоп часу** – 27% і **недахоп інфармацыі** аб дзейнасці моладзевых НДА – 25%. Не бачаць сэнсу ўдзельнічаць у працы моладзевых НДА 17%, баяцца праследу з боку ўлад і адміністрацыі 8%, а 6% апытаных лічыць, што гэтая дзейнасць не прыносіць карысці.

На пытанне: **"Якія моладзевыя НДА Вы ведаеце"** 82,5% адказалі – БРСМ, 17,7% – "Зубр", 14,9% – "Дзедзіч", 8,9% – "Малады Фронт", 2,1% – ЛКСМБ.

80,4% апытаных лічыць, што **незалежных моладзевых арганізацый павінна быць шмат** па розных накірунках дзейнасці (экалогія, культура, спорт і г.д.) і толькі 19,6% – што павінна быць адна моладзевая арганізацыя, якая б займалася ўсімі праблемамі моладзі адначасова. Яшчэ больш адназначна моладзь выказалася па пытанні дзяржаўнай падтрымкі моладзевых НДА: 78,2% мяркуе, што **дзяржава павінна падтрымліваць моладзевыя арганізацыі**, прычым усе існуючыя (па аднолькавых крытэрыях), і толькі 13,8% лічаць неабходным падтрымліваць з дзяржаўнага бюджэту толькі адну масавую арганізацыю. 2,9% маладых людзей мяркуюць, што ўвогуле не трэба падтрымліваць дзейнасць моладзевых НДА з дзяржаўных крыніц.

Нас таксама цікавіла, **якімі павінны быць мэты дзейнасці моладзевых НДА** на думку студэнтаў. Большасць апытаных лічыць, што мэтай дзейнасці моладзевых НДА павінна быць адстойванне інтарэсаў моладзі (27,3%) і працаўладкаванне моладзі (26,5%). Значная частка маладых людзей уважае за найгалоўнейшыя мэты дзейнасці моладзевых НДА таксама асвету моладзі (19,3%) і арганізацыю адпачынку (дасуга) – 17%. 9,8% лічыць, што моладзевыя НДА павінны фармаваць у сваім асяроддзі будучую эліту нашага грамадства.

**Чым павінны займацца моладзевыя НДА** на думку студэнцтва? Большасць лічыць, што асноўнымі накірункамі дзейнасці павінны быць адстойванне правоў моладзі і наладжванне міжнародных моладзевых абменаў (гл. табл. 1).

| Чым, на Вашую думку, павінны займацца моладзевыя НДА, | % |
|---|---|
| 1. Правамі моладзі | 21,98 |
| 2. Моладзевымі абменамі | 19,41 |
| 3. Культурай і гісторыяй | 14,29 |
| 4. Спортам і турызмам | 14,29 |
| 5. Экалогіяй | 10,99 |
| 6. Зменай паліт. рэжыма | 6,59 |
| 7. Усім пералічаным | 11,72 |

Цікава, што калі прапанаваць студэнтам самастойна выбраць моладзевую НДА, сябрам якой яны б жадалі стаць, то атрымліваецца, што **29,8% выбралі б незалежную моладзевую НДА**, 19,1% – БРСМ, 8,2% абралі б іншую прадзяржаўную арганізацыю, 8,2% стварылі б сваю ўласную арганізацыю. Пры гэтым 35% апытаных адзначылі, што ні пры якіх умовах не сталі б сябрамі моладзевых НДА.

Сярод **мерапрыемстваў, у якіх бы студэнты ўзялі актыўны ўдзел**, часцей за іншыя называліся турыстычная вандроўка, дыскатэка і культурніцкія акцыі (гл. табл. 2).

| У якім мерапрыемстве, праводзімым моладзевай НДА, Вы б узялі ўдзел, % | |
|---|---|
| 1. Турыстычная вандроўка | 27,91 |
| 2. Дыскатэка | 18,60 |
| 3. Культурніцкая акцыя | 15,35 |
| 4. Экалагічная акцыя | 11,63 |
| 5. Спартовы турнір | 11,16 |
| 6. Акцыі пратэсту | 6,51 |
| 7. Раздача ўлётак | 3,26 |
| 8. Ані ў якім | 4,65 |

На заканчэнне мы прапанавалі студэнтам выказаць іх стаўленне да магчымага трэцяга тэрміну прэзідэнта А. Лукашэнкі. Дык вось **64,5% маладых людзей не падтрымаюць вылучэнне А. Лукашэнкі на трэці прэзідэнцкі тэрмін,** 6,9% ставяцца да гэтага пытання абыякава, а 4,9% не выступаюць супраць трэцяга тэрміну. Цікава, што 23,7% апытаных выбралі адказ "Цяжка адказаць". Відаць, гэта сведчыць аб тым, што многія маладыя людзі сумняваліся ў ананімнасці праведзенага намі апытання.

Падводзячы вынікі даследвання, трэба адзначыць, што моладзевым незалежным арганізацыям жыццёва неабходна павысіць узровень інфармаванасці моладзі, і ў першую чаргу студэнцтва, аб мэтах сваёй дзейнасці, праводзімых акцыях і праграмах, увогуле заявіць пра існаванне сваёй арганізацыі. Гэтага можна дасягнуць як праз наладжванне супрацоўніцтва з мясцовымі СМІ, якія карыстаюцца папулярнасцю ў моладзевым асяроддзі (мы маем на ўвазе не "Дзедзіч", а шматнакладныя выданні, тэлевізійныя і радыёпраграмы), так і праз правядзенне масавых акцый для маладых людзей, не заангажаваных пакуль у грамадскую дзейнасць. Можна абвесціць шырокамаштабную турыстычную вандроўку ці правядзенне летніка, правесці тэматычную вечарыну ці дыскатэку, арганізаваць культурніцкую акцыю з прыцягненнем вялікай колькасці валанцёраў. А сярод тых, хто адгукнецца на запрашэнне, можна шукаць сваіх прыхільнікаў і будучых актывістаў незалежнага моладзевага руху.

Спадзяемся, што вынікі гэтага даследвання будуць цікавымі для мясцовых улад і тых дзяржаўных органаў, якія адказваюць за выпрацоўку і ажыццяўленне дзяржаўнай моладзевай палітыкі. Магчыма, яны перагледзяць сваё стаўленне да існуючай сістэмы падтрымкі моладзевых грамадскіх аб'яднанняў і будуць раўналежна ставіцца да ўсіх моладзевых арганізацый, негледзячы на тое, малююць яны на сценах надпісы "Я – за бацьку", ці не.

А той частцы моладзі, якая жадае атрымаць інфармацыю аб існуючых у Берасцейскай вобласці моладзевых арганізацыях, раім звяртацца ў рэдакцыю "Дзедзіча". Мы не толькі праінфармуем вас аб усіх моладзевых ініцыятывах рэгіёна, але і паспрабуем пераканаць у вострай неабходнасці вашага асабістага ўдзелу ў грамадскім жыцці краіны.

**Дзмітрый ШЫМАНСКІ**

# ПРЕЗИДЕНТСКИЕ АФОРИЗМЫ

ПРЕЗИДЕНТЫ — ОНИ ТОЖЕ ЛЮДИ. НЕСУТ ЧУШЬ, НЕСУРАЗИЦУ, "САПОГИ ВСМЯТКУ", КАК НЕДАВНО СМАЧНО ВЫРАЗИЛСЯ ВЛАДИМИР ПУТИН. ДА С КЕМ НЕ БЫВАЕТ. ПРЕЗИДЕНТАМ НЕ ПОЗАВИДУЕШЬ, КАЖДЫЙ ЛЯП НА СЛУХУ. НО ИХ И НЕ СМУТИШЬ: ЧЕМ БОЛЬШЕ НЕСУРАЗНОСТЕЙ ПРОИЗНОСИТ ПОЛИТИК... ТЕМ БЛИЖЕ ОН НАРОДУ.

Народу, судя по всему, все равно, как обстоят дела с грамотностью у их президента. Даже "Вашингтон пост" признала, что безумные оговорки президента США Джорджа Буша можно считать "очаровательным недостатком". Мы собрали "очаровательные недостатки" четырех президентов: Владимира Путина, Александра Лукашенко, Леонида Кучмы и Джорджа Буша. Чтобы не очень-то умничали.

## ПРЕЗИДЕНТОМ БЫТЬ НЕЛЕГКО

Л. Кучма: "Я стал более, знаете, злой. Злой в добром понимании этого слова".

А. Лукашенко: "Я вам гарантирую и обещаю, что ответы будут абсолютно искренними и честными. В чем меня, наверное, трудно заподозрить".

В. Путин: "Вы знаете, иногда я возвращаюсь домой, включаю телевизор. И вдруг ведущий на национальном телеканале говорит: "Сегодня президент сделал важное заявление". Но я не говорил ничего особенного".

Д. Буш: "Единственное, мне очень жаль, что я не могу чаще заниматься бегом. Это является одним из самых печальных аспектов президентства".

А. Лукашенко: "Я сам о себе подумал: слава Богу, что есть президент, который может сохранить стабильность в обществе".

## НО ЖИТЬ СТАЛО ЛУЧШЕ

Д. Буш: "Мы самая великодушная страна в мире. Мы очень великодушные. Я горжусь тем, что мы такие великодушные. Но, несмотря на наше великодушие, мы не должны хвастать своим великодушием".

В. Путин: "У нас страна огромных возможностей не только для преступников, но и для государства".

А. Лукашенко: "Должен сказать, что мы в какой-то степени сами создали эти трудности, но сегодня действительно героически их преодолеваем".

## А С ТОЧКИ ЗРЕНИЯ ЭКОНОМИКИ…

Д. Буш: "Основная доля нашего импорта приходится на зарубежные страны".

В. Путин: "С инфляцией ничего необычного не происходит".

Л. Кучма: "Я — президент, глава государства, и не должен заниматься множеством вопросов, которыми приходится заниматься. Экономикой в том числе".

Д. Буш: "Это однозначно включено в план бюджета — там вообще множество цифр и пунктов".

А. Лукашенко: "Я считаю, что любое государство из рыночной экономики немедленно должно брать конкуренцию. Мы тоже берем на вооружение этот принцип и его внедряем, просто порой силой".

## И ВСЕ-ТАКИ МЫ ЗА ДЕМОКРАТИЮ!

Д. Буш: "У нас прошло хорошее заседание администрации, на котором министр обороны и госсекретарь рассказали нам о нашем желании распространения демократии по всему миру".

А. Лукашенко: "Конечно, вам решать, но будет так, как я сказал".

В. Путин: "Мне просто не хочется, чтобы исполнительная власть в стране чрезмерно увлекалась политической тряской. У нас есть органы власти, которые профессионально этим занимаются".

## БЕЗ НАС ВЫБОРЫ НЕ ПРОЙДУТ

В. Путин: "То, как прошла избирательная кампания, избавило меня от главной необходимости — необходимости вводить в заблуждение массы населения".

Л. Кучма: "Если проиграю на выборах — выпью стакан водки, закушу салом и буду дальше работать".

А. Лукашенко: "Согласен хоть завтра провести досрочные выборы, хотя вы толкаете меня на нарушение Конституции. Но если побеждаю на них с процентом не ниже 90, Беларусь становится членом Европарламента и Евросоюза".

## НО МЫ МОЖЕМ ПОДНЯТЬСЯ С КОЛЕН…

Л. Кучма: "Украина — бедная страна со многими проблемами, о которой можно сказать все, что угодно, и по которой можно пройтись, вытерев ноги, как о мокрую тряпку, и пойти дальше".

В. Путин: "Россия может подняться с колен и как следует огреть".

Д. Буш: "Мы должны защитить родину нашей страны".

А. Лукашенко: "Жизненный уровень, который сегодня у белорусского народа по разным причинам ниже колена, еще ниже быть не может".

## ПРЕЗИДЕНТЫ ДРУГ О ДРУГЕ

В. Путин: "То кровосмешение между русскими и украинцами, которое происходило на протяжении столетий, не оставляет нам никакого выбора".

Л. Кучма: "Над нами нет ни туч, ни хмари... Температура соответствующая — ни жарко, ни холодно" (об отношениях Москвы и Киева).

А. Лукашенко: "Нам нужно строить Союзное государство исходя из собственных интересов, как учит господин Буш".

В. Путин: "Джордж Буш такой замечательный человек, что даже если он не понимает моего английского вообще, он делает вид, что понимает, о чем я говорю".

А. Лукашенко: "Если отбросить личностные оскорбления, нам удалось встряхнуть отношения между нашими народами" (о переговорах с Путиным).

В. Путин: "Я не очень был взволнован тем, что ночевал на ранчо Буша. Я думаю, что он сам должен был думать о том, что происходит, если он запустил к себе бывшего сотрудника советской внешней разведки".

## ОСОБЕННО Я ЛЮБЛЮ…

Л. Кучма: "Особенно я люблю ковыряться в земле. На даче, где я живу, всю округу заставил работать".

Д. Буш: "Лора и я частенько вообще не замечаем, какие же толковые у нас дети, пока не получаем данных объективного анализа".

А. Лукашенко: "Извините за нескромность, но Ельцин со мной на корте не справляется. Коржаков не справляется. Лужков проиграл три раза. В последний раз с Лужковым мы играли на 5 тысяч тонн сливочного масла".

**"Комсомольская правда в Белоруссии"**

## АДНЫМ РАДКОМ

### А ЯК ТАМ?

З 19 па 26 студзеня адбывалася паездка маладых палітыкаў Беларусі ў Швецыю. Асноўнай ідэяй паездкі было знаёмства беларускай моладзі з сістэмай самакіравання Швецыі. Адбыліся таксама сустрэчы з прадстаўнікамі партый і НДА.

– Дзейнасць мясцовага самакіравання Швецыі на практыцы мне даводзілася назіраць упершыню, – кажа Уладзімір Тарноўскі, прадстаўнік БАМГА "Сузор'е", – дапамагаў нам у гэтым мэр горада Стронгнас. – Падчас візіту ў гэты горад мы сустрэліся з прадстаўнікамі мэрыі, наведалі еўрашколу, дом састарэлых. Асноўнае ўражанне – гэта тое, што там улады існуюць для людзей, а не наадварот, як мы прызвычаіліся назіраць у Беларусі. Просты прыклад – самакіраванне еўрашколы, а гэта моладзь 8-10 класаў (!), ініцыявала ўсталяванне дадатковых ліхтароў каля школы. Яны звярнуліся з петыцыяй да мясцовага савету і ўжо праз 2 тыдні мясцовыя дэпутаты прымаюць пазітыўнае рашэнне. Такому мясцоваму савету я згоден плаціць падаткі...

Не пакінуў без увагі знаходжанне дэлегацыі з Беларусі і ўрад Швецыі. Маладыя палітыкі атрымалі запрашэнне наведаць Рыксдаг, дзе Віктар Норберг – дэпутат парламента, распавёў пра сваю дзейнасць.

– Асноўным вынікам паездкі лічу ўсталяванне кантактаў з моладзевымі арганізацыямі і партыямі Швецыі, – кажа Салаўёва Надзея, прадстаўніца студэнцкага самакіравання горада Віцебска, – спадзяюся, гэта дасць магчымасць наладзіць праграму абменаў паміж нашымі краінамі для таго, каб моладзь нашага інстытута мела магчымасць пабачыць – будучае робіца сваімі рукамі!

**Dzedzich week-news**

### ЗБЕРАЖЫ МІНУЎШЧЫНУ, КАБ МЕЦЬ БУДУЧЫНЮ

Ініцыятыўная група моладзі, прадстаўнікі БАМГА «Сузор'е», студэнты і выкладчыкі БрДУ звярнуліся ў гарвыканкам з просьбай падтрымаць праект кансервацыі руін былога кляштара бернардзінак, што знаходзіцца на Шпітальным востраве Берасцейскай крэпасці.

Праект прадугледжвае збор сродкаў грамадзян, прадпрыемстваў і ўстаноў на кансервацыю будынку кляштара – адзінага будынку, што захаваўся з часоў старога Берасця.

Адзін з ініцыятараў праекта кансервацыі, кіраўнік БАМГА «Сузор'е» Д.Шыманскі кажа:

– Як вядома, расейцы, якія ў 1830-я гады будавалі Берасцейскую крэпасць, знішчылі дашчэнту старажытны Берасце, а замест яго пабудавалі новы горад, на 4 км на ўсход. Ад былога горада захаваўся толькі будынак кляштара бернардзінак, які выкарыстоўваўся вайскоўцамі спачатку як кадэцкі корпус, а пасля як шпіталь. Калі мы не здолеем закансерваваць гэты будынак, мы згубім апошняе сведчанне веліччы сярэднявечнай архітэктуры і гісторыі нашага гораду.

Мы спадзяемся, што знойдзем паразуменне і падтрымку гарадскога кіраўніцтва. Не трэба забывацца, што ў хуткім часе мы будзем адзначаць 1000-годдзе Берасця. І было б добра, каб да гэтага часу мы маглі прэзентаваць гасцям не толькі музей «Бярэсце» і крэпасць, але і гісторыю сярэднявечнага Берасця – аднаго з найбуйнейшых цэнтраў грамадска-палітычнага жыцця Вялікага княства Літоўскага.

**Dzedzich week-news**

## ПОШТА ДЗЕДЗІЧА

*Паважаная рэдакцыя!*

*Я з'яўляюся прыхільніцай вашых ідэй, адчуваю сябе сапраўднай беларускай. Ужо даўно і з вялікай цікавасцю сачу за вашай дзейнасцю, вельмі люблю і заўсёды чытаю "Дзедзіч". (...) А звярнулася я да вас з просьбай (ці прапановай) не друкаваць на старонках бюлетэня пошлыя показкі. Я разумею, што гэтым матэрыялам прыцягваецца ўвага большасці, аднак мяркую, што асноўныя чытачы бюлетэня – лепшая, элітная берасцейская моладзь.*

*Можа, я не маю рацыі і ў некага ёсць іншае меркаванне на гэты конт, але я ўпэўнена, што мая думка мае права быць выказанай. Дзякуй.*

***Алена***

**АД РЭДАКЦЫІ:**

Паважаная Алена!

Нам вельмі прыемна, што Вы лічыце наш бюлетэнь скіраваным на элітную моладзь, але так не лічым мы. Бюлетэнь адрасаваны ўсёй берасцейскай моладзі без выключэння. Да таго ж, наш чытач вольны ў сваім выбары – што чытаць. Аднак, беручы пад увагу дасланы Вамі ліст, і каб у маладых берасцейцаў не склалася ўражанне, што ў рэдакцыі працуюць непаўнавартасныя і абмежаваныя людзі, мы разам з показкамі пастараемся змяшчаць "больш інтэлектуальную" інфармацыю:

### "ПРАЦЯГНІ ДУМКУ"

У дадзеным практыкаванні прапануецца завяршыць афарыстычную думку, праверыўшы сябе, наколькі Вы здольныя вызначыць галоўную ідэю выказвання і "правільна" завяршыць яе. "Правільнымі" лічацца таксама адказы, максімальна набліжаныя па сэнсе і змесце да адказаў.

Галоўная мэта задання – не столькі ўгадаць слова, колькі прымусіць сябе думаць, уключыцца ў інтэлектуальна-пазнавальную дзейнасць, якая дазваляе ўдасканальваць свае ацэначныя і пазнаваўча-эўрыстычныя здольнасці.

1. Жыццё прыгожае на столькі, на колькі мы здольныя гэта ... (што зрабіць?).
2. Калі чалавек перастае верыць у сябе, ён падсвядома пачынае верыць ... (у што?).
3. Раскрываць сябе трэба ў першую чаргу для ... (каго?).
4. З безвыходнага становішча выйсце звычайна там жа, дзе і ... (што?).
5. Той, у каго бываюць паражэнні, часцей за ўсё і ... (што робіць?).
6. Той, хто змагаецца, можа прайграць, той жа, хто не змагаецца, ужо ... (што зрабіў?).
7. Апераджаць час трэба ... (як?).
8. Пазнаўшы сябе, чалавек ужо не застаецца тым, ... (кім?).
9. У чалавека няма няшчасцяў, страт і паражэнняў, акрамя тых, якія ён ... (што робіць?).
10. Будзьце ўважлівыя да сваіх думак, бо яны – пачаткі ... (чаго?).
11. Мастацтва быць мудрым заключаецца ва ўменні ведаць, на што не варта звяртаць ... (чаго?).
12. Недастаткова валодаць мудрасцю, трэба ўмець ... (што рабіць?).
13. Быць сучасным – значыць апераджаць свой час дакладна на столькі, каб ён мог з поспехам цябе ... (што зрабіць?).
14. Лёгка крытыкаваць аўтара, але цяжэй ... (што зрабіць?).
15. Навучыцеся губляць, набываючы, і набываць, ... (што робячы?).

**Адказы**

| | | |
|---|---|---|
| 1. зразумець. | 6. прайграў. | 11. увагі. |
| 2. шчаслівы выпадак. | 7. своечасова. | 12. карыстацца ёю. |
| 3. самога сябе. | 8. кім быў. | 13. дагнаць. |
| 4. уваход. | 9. прызнае. | 14. ацаніць яго. |
| 5. перамагае. | 10. учынкаў. | 15. губляючы. |

# СУСВЕТНЫ ТУР ЗАБОЙЦЫ

**ЛЕТАСЬ СУСВЕТНАЯ СУПОЛЬНАСЦЬ УЗГАДАЛА ПРА 40-Я ЎГОДКІ ЗАБОЙСТВА ПРЭЗІДЭНТА КЕНЭДЗІ. У ДНІ, КАЛІ ЎСЕ, БЫЦЦАМ ДАМОВІЎШЫСЯ, МУСОЛІЛІ ГАДАВІНУ ЗАБОЙСТВА КЕНЭДЗІ, МЫ СКАНЦЭНТРАВАЛІ ЎВАГУ НА АСОБЕ КІЛЕРА — ЛІ ХАРВІ ОСВАЛЬДА І ЯГО ВЯЛІЗНЫМ КУЛЬТУРНА-ПАЛІТЫЧНЫМ ЗНАЧЭННІ ДЛЯ БЕЛАРУСІ.**

У свой час будучага снайпера пераклініла абмяняць свой арлісты пашпарт з надпісам "In God we trust" на сярпаста-малаткасты з дэвізам "Пролетарии всех стран, соединяйтесь!" і менскай прапіскай.

Асоба Освальда ўвайшла ў сонм славутасцяў нашай Бацькаўшчыны поруч з буслом, "Песнярамі" і старадароскім першаком. У будучым турыстычныя канторы проста прырэчаны эксплуатаваць факт, што забівацъ Кенэдзі Освальд выправіўся з аэрапорту "Менск-1". Гэта наш абсалютны эксклюзіў. Які турыст адмовіцца сфоткацца на памяць каля музею ВАВ, дзе, паводле словаў гіда, невядомы беларускі партызан навучыў Освальда снайперскаму рамяству. Або набыць сувенірную t-shirt са слоганам: "Лі Харві Освальд. Сусветны тур забойцы: Менск, 1960 г. — Далас, 1963 г.". Тут няма нічога благога: Чыкага эксплуатуе вобраз сталіцы гангстэраў, Сан-Францыска вабіць турыстаў засценкамі Алькатрасу, Лондан — васковым статуём Джэка Вантробніка. Бізнэс ёсць бізнэс.

Яшчэ больш цікавы палітычны аспект феномену Освальда. ¨н несвядома ўклініўся ў айчынную традыцыю радыкальнага супраціву, закладзеную "кінжальшчыкамі" Каліноўскага і працягнутую бамбістамі Грынявіцкім і Пуліхавым, мястэчковымі габрэямі-тэрарыстамі, партызанамі Прытыцкім і Мазанік ("Беларускага вызвольнага войска", якое прыпісала сабе Глеба Самойлава і кучу катастрофаў эндагеннага характару, я не ўлічваю).

Патрапіўшы ў такую лігу выдатных джэнтльменаў, Освальд з забойцы-псіхапата ператвараецца ў сімпатычнага палітідэаліста, якому проста не падфарціла. І адразу робіцца прывабным аб'ектам для палітычнага піяру. Яшчэ ў 1997г. маладафронтаўцы ўдала выкарыстоўвалі вобраз Освальда, арганізаваўшы турнір па стральбе на прыз яго імя.

У чынак Освальда тлумачылі кантактамі з КГБ, з ФБР, з мафіяй, з Фідэлем Кастра, з антыкастрыстамі, латэнтным каханнем да Мэрылін Манро... У будучым трэба абавязкова чакаць беларускіх інтэрпрэтацыяў піф-пафу ў Даласе.

**Версія A.** "Рука Бога" (для панславістаў). Лі Харві, тусуючыся ў Менску, прыняў праваслаўе. Неяк падчас посту яму з'явіўся сам арханёл Міхал з інструкцыяй: "Раб божы Лі Харві, ступай у Амерыку і пакарай каталіка Кенэдзі". Захоплены перспектывамі выратавання хрысціянскай айкумены, Освальд выканаў місію.

**Версія B.** "Рука нацыі" (для нацдэмаў). У Менску Освальд скантачыўся з беларускім нацыянальным падполлем — групай "Чорны кот — Белая котка". Пад нікам "Ясь з-пад Пітсбургу" Освальд удзельнічаў у знішчэнні кукурузных пасеваў у пік хрушчоўскай кампаніі кукурузізацыі. Вярнуўшыся ў ЗША, Освальд прымае грамадзянства БНР. Калі Кенэдзі зарэкамендаваў сябе мяккацелым прэзідэнтам, гатовым на саступкі імперыі зла, Освальд вырашыў адпомсціць ворагам нацыі.

**Версія C.** "Рука класа" (для левых). Працоўнаму калектыву "Гарызонту" абрыдзела адлічваць частку заробку ў фонд дапамогі Антыімперыялістычнаму фронту вызвалення Экватарыяльнага Бутану імя Рабіната Тагора. Каб пакончыць з несправядлівасцю, гарызонцкая прафпярвічка вырашыла элімінаваць саму крыніцу імперыялізму — знішчыць прэзідэнта ЗША. Освальд бліскуча выканаў загад працоўных.

Як бы ні скончылася спрэчка за сімвалічную спадчыну Освальда, відавочна адно: сёння сімваламі Беларусі ў свеце з'яўляюцца прэзідэнт і забойца прэзідэнта. Вось такая ў нас вонкавая самарэпрэзэнтацыя.

**Лёлік УШКІН, "Наша ніва"**

# МАЙСТАР І МАРГАРЫТА – БЕЛАРУСКІ ВАРЫЯНТ

**І ІНШЫЯ ЦУДЫ, ЯКІЯ ЗМЯШЧАЕ "БЕЛАРУСКАЯ ПАЛІЧКА"**

Я ўжо бачу, як вашыя вочы наліліся праведным гневам. Святатацтва! Чытаць Булгакава у перакладзе – усе адно, што піць хуткарастварымую гарэлку ў таблетках. Булгакава варта чытаць толькі ў подлініке, выключна ў подлініке, ад сёння і ва вечныя вякі, скажаце вы мне. У знак згоды я адкажу вам – амінь!

Але калі вы зрабілі гэта сямнаццаць разоў?! З уласнага вопыту: на васямнаццатым прыходзіць адчуванне, што вы здольныя перачытаць "Кансультанта з капытом" (першая назва рамана "Майстар і Маргарыта" з чарнавікоў Міхаіла Аляксандравіча) і без кніжкі, а літары ўстаюць са старонак і як добрыя знаёмыя паціскаюць руку. Калі вашая літаратурная жарсць таксама прыняла паталагічную стадыю, то раю Вам пакаштаваць гэта экзатычнае блюда: "Майстар і Маргарыта" па-беларуску. Гэта зусім новае адчуванне. Спачатку вас будуць вывадзіць з раўнавагі нятрапныя словы. Палову першай главы вы будзеце лавіць блох у тэксце і лаяць перакладчыка апошнімі словамі. Але потым вы адчуеце… ГЭТА нібы Джаконда, намаляваная ўзімку. Усе тое самае: і усмешка, і паголены лоб, і, толькі пільна прыглядзеўшыся, вы зразумееце у чым справа: у валасы Моны Лізы набіўся снег, а Майстар размаўляе з Маргарытай па-беларуску…

Але, годзе вычварэнскіх асацыяцый. Лепш адзін раз пабачыць, таму, за мной, чытач! Хто сказаў табе, што ў Інтэрнэце няма нічога сур'эзнага, сапраўднага, вечнага? Няхай вырвуць хлусу яго слізкі язык. За мной, чытач, і ты пабачыш, што ў неабсяжнай сусветнай шафе ёсць палічка, якая абавязкова зацікавіць цябе.

Акрамя "М і М", якіх я ўпарта піярыла на працягу ўсяго артыкулу, там ёсць яшчэ купа смачных рэчаў. Пачынаючы са Статута 1597 (для гурманаў) і заканчваючы свежым нумарам "Студэнцкай думкі" (для тых, хто любіць "погорячее"), да таго "Алеся ў краіне цудаў" дзядулі Кэрала і "Як брыгадзір Жэрар трапіў у Менск" Конан Дойля, нэафальклор Беларусі ("Бацянька" і інш.), а таксама яшчэ шмат і шмат рэчаў, якія вы не пабачыце на рэальных палічках букіністычных крамаў. Таму ўсім, хто жадае пакаштаваць "адборнай" беларускай класікі і адборнага беларускага самвыдату нагадваю адрас: **www.knihi.com.**

Ляцім са мной, дарагі чытач, у віртуальнасці шмат неспадзяваных цікавасцяў!

**Алеся ГАРДЭ**

# ПОЧЕМ КАРТОШКА ДЛЯ ТОЛСТОСУМОВ?

ГАЗЕТА BILD ПРЕДЛАГАЕТ ЧИТАТЕЛЯМ СПИСОК САМЫХ ДОРОГИХ ВЕЩЕЙ В МИРЕ, В КОТОРЫЙ ПОПАЛИ САМЫЙ ДОРОГОЙ СЕРИЙНЫЙ АВТОМОБИЛЬ, САМЫЙ ДОРОГОЙ КОСТЮМ, САМАЯ ДОРОГАЯ ПАЧКА СИГАРЕТ И МНОГОЕ ДРУГОЕ.

**Самая дорогая женщина в мире**

Самая дорогая женщина в мире — голливудская актриса Дженнифер Лопес. Ее тело застраховано в одной нью-йоркской страховой компании на сумму 1 миллиард евро. Особой ценностью актрисы является ее легендарный зад.

**Самый дорогой фильм в мире**

Самый дорогой фильм в мире — по-прежнему "Титаник" режиссера Джеймса Камерона. На создание "Титаника" ушло более 200 миллионов долларов.

**Самая дорогая рекламная кампания в мире**

В 2002 году фирма Pepsi пригласила поп-певицу Бритни Спирс для рекламирования своей продукции. За 90-секундный ролик знаменитый производитель прохладительных напитков выложил 7,53 миллиона долларов. На протяжении полутора минут, что идет реклама, Бритни успевает совершить путешествие во времени, сменить несколько нарядов и предстать в разных образах. Ролик был снят специально к финалу чемпионата по американскому футболу. По неофициальной информации, гонорар Бритни Спирс за участие в рекламе составил 1 млн. долларов.

**Самое дорогое путешествие в мире**

Американский бизнесмен Дэнис Тито и компьютерный миллионер из ЮАР Марк Шаттлворт заплатили каждый по 20 миллионов долларов за то, чтобы слетать на МКС.

**Самая дорогая избирательная кампания в мире**

Этот рекорд принадлежит Майклу Блумбергу, который баллотировался на пост мэра Нью-Йорка в 2001 году. Каждый из 744 757 поданных за него голосов обошелся ему в 92 доллара 60 центов. Вся избирательная компания обошлась Блумбергу в 62 миллиона долларов.

**Самый дорогой город в мире**

Нигде жизнь не стоит так дорого, как в Токио.

**Самый дорогой серийный автомобиль в мире**

Сидения трансформируются в лежачее положение, DVD-плеер, Doulby Surround Sound — за такую роскошь нужно платить! Модель автомобиля Maybach 62 обойдется вам "всего лишь" в 360 тысяч евро.

**Самая дорогая обувь**

Поистине драгоценные туфли на высоком каблуке были изготовлены знаменитым ювелиром Стюартом Вайцманом. Они украшены 642 рубинами. Цена — 1,6 миллиона евро. Сверкающие босоножки представляют собой копию туфелек Дороти из фильма "Волшебник страны Оз". Рубиновые туфли были сделаны Вейцманом специально для известной голливудской актрисы, имя которой не разглашается.

**Самая дорогая картина в мире**

Самая дорогая картина в мире — полотно Питера Пауля Рубенса "Избиение младенцев". "Избиение младенцев" было написано Рубенсом во временном промежутке между 1609 и 1611 годами. Картина была продана с аукциона Sotheby's в июле 2002 года за 49,5 миллиона фунтов стерлингов (около 75 миллионов долларов).



**Самые дорогие сигареты в мире**

Марка Treasurer. Одна пачка стоит примерно 24 евро. Продается только в специализированных магазинах.

**Самый дорогой картофель в мире**

Сорт La Bonnotte из Франции. Продается примерно по 500 евро за килограмм.

**Самый дорогой кофе в мире**

Сорт Kopi Luwak с острова Суматра. Четверть фунта стоит около 75 долларов. На кофейных плантациях Явы и Суматры водится необычный сумчатый зверек — Luwak (Paradoxurus hermaphroditus). Питается он исключительно спелыми кофейными бобами. Luwak не может переварить кофейное зернышко и избавляется от него "естественными путями". Местные жители старательно собирают не переваренные зверем кофейные зерна, из которых и готовится самый дорогой в мире кофе. Богатый вкус этого напитка объясняется особыми свойствами желудочного сока животного.

**Самый дорогой костюм в мире**

Костюм американских космонавтов. Он стоит 9 миллионов долларов и одновременно является самым дорогим предметом одежды в мире.

**Самая дорогая гостиница в мире**

Семизвездочная гостиница Burj Al Arab в Дубае. За самый скромный номер придется заплатить 770 евро за ночь, а королевские апартаменты обойдутся вам в 7 700 евро.

**Самый дорогой стадион в мире**

Самый дорогой стадион в мире — Stade de France недалеко от Парижа. Здесь в 1998 году национальная сборная Франции выиграла чемпионат мира. Его строительство обошлось в 460 миллионов евро.

**Самая дорогая акция в мире**

Одна биржевая акция американской инвестиционной фирмы Berkshire Hathaway стоит более 64 тысяч евро. Компания Berkshire Hathaway принадлежит миллиардеру Уорену Баффету. Berkshire Hathaway контролирует множество компаний, работающих в различных отраслях традиционной экономики, включая финансовые услуги, кондитерское производство, издательское дело, ювелирный бизнес, производство мебели и ковров, производство строительных материалов и многое другое. Berkshire Hathaway принадлежат крупные пакеты акций компаний Coca-Cola, American Express, Gillette, The Washington Post.

**Самый дорогой футболист в мире**

Самый дорогой футболист в мире — это Зинедин Зидан. В 2001 году французский игрок за рекордную сумму в 68,7 миллионов евро перешел из "Ювентуса" в "Реал" (Мадрид).

**Самых дорогой бюстгальтер в мире**

Он стоит 12,5 миллионов долларов. Немецкая фотомодель Хайди Клум демонстрировала его на одном из показов мод в Нью-Йорке.

**Самый дорогой комикс в мире**

Комикс про мальчика Тима и его собачку Штруппи. Один коллекционер заплатил 100 тысяч евро за оригинал титульной картинки выпуска "Черный остров".

**Самый дорогой брэнд в мире**

Самый дорогой брэнд в мире — Coca-Cola. Ее стоимость оценивается в 68,9 миллиардов долларов, что составляет почти 60 процентов стоимости всей фирмы.

**Самая дорогая кукла "Барби" в мире**

Самая дорогая кукла "Барби" в мире стоит 100 тысяч евро. На ней надето платье, украшенное настоящими бриллиантами.

**Самая дорогая книга в мире**

"Лестерский кодекс" Леонардо да Винчи, "Трактат о воде, земле и небесных делах", выполненный зеркальным шрифтом на дорогой бумаге с полотняной отделкой. Билл Гейтс купил ее за 24 миллиона долларов.

www.naviny.by

## ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР

### 4 ЛЮТАГА

У гэты дзень у 1746 г. нарадзіўся **Тадэвуш Касцюшка**. Поўнае імя ў яго было Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка, а прыйшоў ён на свет у фальварку Мерачоўшчына пад Івацэвічамі.

Напэўна, у той лютаўскі дзень ніхто са сваякоў у самых смелых фантазіях не ўявіў бы, які лёс чакае гэтага хлапца з беларускага шляхецкага роду. А пачынаў Касцюшка сваю кар'еру па вайсковай лініі. Скончыў Варшаўскі кадэцкі корпус, наведваў заняткі ў Парыжскай вайсковай акадэміі, пасля добраахвотнікам пайшоў на вайну за незалежнасць ЗША, стаў сябрам прэзідэнта Томаса Джэферсана. У 1784 г. Касцюшка вярнуўся на радзіму і тут узначаліў антырасейскае паўстанне 1794 г. Федэратыўная дзяржава Рэч Паспалітая была падзеленая паміж імперыямі. Наш край дастаўся Расеі. Супраць гэтай акупацыі і ўзнялося паўстанне на чале з Касцюшкам. У бітве пад Рацлавіцамі Касцюшкава войска разбіла расейскую армію. А ў бітве пад Мацяёвіцамі Касцюшка быў цяжка паранены і трапіў да расейцаў у палон. Патаемна, пад чужым прозвішчам "шляхціч Шыманскі" яго перавезлі ў Петрапаўлаўскую крэпасць. Пасля вызвалення мужны змагар зноў пабываў у ЗША, а пасля вярнуўся ў Еўропу. Памёр ён у 1917 г. у Швейцарыі.



### 9 ЛЮТАГА

9 лютага 1886 г. нарадзіўся **Аляксандр Мяснікоў**, адзін з першых камісараў-начальнікаў БССР, які лічыў, што беларусаў як асобнага народу няма. Сапраўднае яго прозвішча – Мяснікян, і да нас ён прыбыў з Расеі разам з бальшавіцкай рэвалюцыяй. Такі сабе ваенна-камуністычны дзеяч з тых, што з гонарам любяць паўтараць: «Мы універсіцетаў не канчалі», – быццам невуку і сапраўды ёсць чым ганарыцца.

### 12 ЛЮТАГА

12 лютага 1798 г. пакінуў гэты свет **Станіслаў Аўгуст Панятоўскі**, апошні польскі кароль і Вялікі князь Літоўскі. ¨н паходзіў з беларускай шляхты і пахаваны на тэрыторыі Беларусі — у Воўчыне каля Вяліка-Літоўска. Яму прыпісваюць адначасова росквіт і заняпад краю. Сапраўды, за Панятоўскім у Вялікім княстве рабіліся вялікія пераўтварэнні і развіваліся мастацтвы, але за ім жа Княства і ўся Рэч Паспалітая была падзеленая паміж трыма імперыямі і фактычна перастала існаваць як самастойная дзяржава. Беларускія і Літоўскія землі былі захоплены Расеяй.



# СЛОВА-СТРАШИЛКИ

## или ЭКСКУРС В СЧАСТЛИВОЕ ДЕТСТВО

**В ДОМЕ ПОВЕШЕННОГО НЕ ГОВОРЯТ О ВЕРЕВКЕ. НЫНЕШНЕЕ ПОКОЛЕНИЕ СТУДЕНТОВ НЕ ЗАСТАЛО ВЕЛИКОЙ ЭПОХИ. А ЕСЛИ БЫ НАШИ РОДИТЕЛИ ПОЗНАКОМИЛИСЬ ЛЕТ НА 5 РАНЬШЕ, ТО МЫ БЫ ПРОЧУВСТВОВАЛИ НА СВОИХ СОБСТВЕННЫХ ШЕЯХ ЭТО ОЩУЩЕНИЕ ЗАТЯГИВАЮЩЕГОСЯ УЗЛА. НО НАМ ПОВЕЗЛО. МЫ – ПОКОЛЕНИЕ, ЧЬЕ ГОРЛО НЕ СДАВЛИВАЛ ПИОНЕРСКИЙ ГАЛСТУК.**

Идеология. Сейчас это слово повторяют все. Но в молодых умах оно не вызывает ничего кроме ядовитых шуток.

То ли было раньше. Идеологию ели вместе с плавленым сырком "Дружба", она лилась из каждой радиоточки, ее вдыхали вместе с духами "Красная Москва". Даже на стенах коммунальных кухонь писалось что-то вроде "Ведро помойное не уберешь – в спину революции лишний нож". Она была во всем. Но само слово "идеология" звучало крайне редко, что вполне объяснимо. Ведь она была Высшим Началом, Великой Целью, Божеством…

Имя ее не произносили всуе.

Эта лексическая брешь с лихвой заменялась другими словами. Ребенок мог написать "чилавек", "нашол", но в словах "свет коммунизма" ошибку он не допускал. С помощью нехитрых манипуляций на каждое слово ребенку прививали рефлекс. Механизм, отработанный доктором Павловым на собаках, действовал и на советских детишек.

Все просто. Сначала рассказать, что капиталисты украли у отчизны все конфеты. Но зато потом далекое и непонятное "Слава КПСС" пришлет хлебу с сахаром и скажет, ешь малыш, пока пузо не треснет.

Для закрепления эффекта фишку повторяют раз …-надцать. И неудивительно, что, даже став пенсионером бывший пионер наливается яростью от слова "предприниматель", и умильно рыдает над любым оттенком красного.

И слов тогда знали много. Лексический запас был не в пример нынешней молодежи обширный. Коммунист, социалист, активист – это если человек хороший. А вот под словами капиталист, индивидуалист, националист скрывались сволочи и враги народа. Ах, что сотворили с этими ни в чем не повинными словами! Даже сейчас, когда от советской идеологической машины остались дымные головешки – мы помним. В генах засели эти условные рефлексы, которые вдавливались в мозг нашим родителям. И мы, которые тусуемся в чатах с представителями этих самых "капиталистических стран", все-таки считаем слово капиталист – плохим словом. А слово "националист" у нас вывязывается в цепочку "националист - нацист - фашист" и тоже пугает. До сих пор большинство считает, что националист – это не тот, кто любит свою национальность, а тот, кто ненавидит все прочие. Такая вот "социалистическая отрыжка".

**P.S.:** Коммунистическое воспитание топталось по нашему сознанию, не снимая сапог. Культ Павлика Морозова, презрение к "интеллигентикам" и кровная ненависть или любовь к словам, которые заканчиваются на "ист". Из обилия всевозможных "методов воздействия" мы испытали только звездочку с "кудрявым Ильичом" нашпиленную над сердцем. Это первый этап в игре "ребенок – собачка Павлова". Мы спрыгнули. Нам повезло. Так давайте чистить свои мозги от генетической грязи.

**Алеся ГАРДЭ**

# РАЗБОРКІ Ў ПАЎСТАНЦКАЙ ПЯСОЧНІЦЫ

**22 САКАВІКА СПАЎНЯЕЦЦА 160 ГАДОЎ З ДНЯ СМЕРЦІ КАСТУСЯ КАЛІНОЎСКАГА. ГЭТАГА ТЭРМІНУ АКАЗАЛАСЯ ДАСТАТКОВА, КАБ ЗРАБІЦЬ ПАЎСТАНЦА НЕ ТОЛЬКІ ЗНАКАМІТЫМ У ВУЗКІМ КОЛЕ ЦІКАЎНЫХ, АЛЕ І ПРЫВЕСЦІ ЯГО АСОБУ Ў АДПАВЕДНАСЦЬ З НАЦЫЯНАЛЬНЫМІ ЗАБАБОНАМІ І КОМПЛЕКСАМІ.**

Вобраз гэтага харызматычнага паўстанца амаль што паўтара стагоддзя абрастаў самымі супярэчлівымі міфамі. Асабліва спрэчным з'яўляецца пытанне аб тым, патрыётам якой краіны ён з'яўляецца. Кожны з зацікаўленых бакоў, ці то беларусы, ці то палякі, ці наогул літоўцы, цягне коўдру на сябе і, падтасоўваючы (з пераменным поспехам) факты, малююць "свайго" Каліноўскага. Адной з найважнейшых памылак (наўмысных ці несвядомых) з'яўляецца тут ігнараванне тагачаснага культурнага і палітычнага кантэкста. Беларусь як асобны палітычны суб'ект была тады не болей, чым віртуальным праектам, які існаваў у галовах хіба што некалькіх рэвалюцыянераў-дэмакратаў. Прычым нават яны звязвалі палітычную будучыню "Літвы" з дзяржавай польскай, разлічваючы на цесны саюз з ёй. То бок праекты будучай арганізацыі дзяржаўнага жыцця мелі выразны канфедэратыўны характар.

Сам Каліноўскі, патрабуючы роўнасці паміж польскім і "літоўскім" камітэтамі, верагодна, разумеў, што без падтрымкі сялянства, абапіраючыся толькі на шляхту, ён прайграе. Барацьба ўнутры лагера рэвалюцыянераў, па-сутнасці, была барацьбою паміж адэптамі прашляхецкай ("белыя") і прасялянскай ("чырвоныя") груповак.

Менавіта гэтая акалічнасць была ці не галоўнай прычынай пройгрышу. "Ідэалісты і рамантыкі", як пра іх любяць казаць, аказаліся насамрэч сапраўднымі ўласнай амбітнасцю дзецюкамі. Адразу пасля пачатку паўстання пачаліся разборкі "чыя гэта машынка" і "хто ў двары галоўны". Скеміўшы што да чаго, цынічныя (а таму й больш разумныя) расейцы пачалі баламуціць сялянства, выкарыстоўваючы любыя сродкі. У ходу йшлі як звычайны подкуп, шантаж, так і тое, што зараз атрымала назву "чорнага піяру".

Агульнае месца большасці манаграфій на гэтую тэму – падкрэсліванне высокай духоўнасці Каліноўскага & Co. Не буду пярэчыць: так, аддадасць ідэалам, вернасць народу – усё гэта добра. Але для перамогі гэтага недастаткова. Галоўнае на вайне – халодная галава плюс валоданне тактыкай. І калі другі пункт больш-менш выконваўся, то наконт галавы сітуацыя была абсалютна «лажовай»: сваркі і спрэчкі паміж сабой за лёс "радзімага" краю, "любай" Айчыны мелі даволі сімптаматычны характар. Напэўна, не надта ўжо і "любай" была тая Айчына, калі хаўруснікі, высвятляючы паміж сабой адносіны, забыліся, што па той бок знаходзіцца праціўнік, які пазірае на гэтую дзіцячую валтузню з задаволенай усмешкай.

**Сяргей ПРЫЛУЦКІ**

*Ад прадзедаў спакон вякоў нам засталася спадчына... (Я. Купала)*

# З НОВЫМ СВЯТАМ?

**КАЛІСЬЦІ, ЯШЧЭ ЗА ЧАСАМІ СССР, БЫЛО ТАКОЕ СВЯТА – ДЗЕНЬ САВЕЦКАЙ АРМІІ І ВАЕННА-МАРСКОГА ФЛОТУ. ЯК ВЯДОМА, САВЕЦКІ САЮЗ ПАСПЯХОВА "ЛЯСНУЎСЯ", АЛЕ СВЯТА ЗАСТАЛОСЯ, ХОЦЬ ЗАВЕЦЦА ЯНО ЦЯПЕР ПА-ІНШАМУ – ДЗЕНЬ АБАРОНЦЫ АЙЧЫНЫ. ДАТА – 23 ЛЮТАГА – ТАКСАМА НЕ ЗМЯНІЛАСЯ, ХОЦЬ ПРЫВЯЗАНАЯ ЯНА ДА ДНЯ "МАСАВАГА ЎЛІЦЦЯ ДОБРААХВОТНІКАЎ У ЧЫРВОНУЮ АРМІЮ Ў 1918Г. ДЛЯ АБАРОНЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ АЙЧЫНЫ" І ЖАДАНАГА ПРАМОГА ДАЧЫНЕННЯ ДА ГІСТОРЫІ НАШАГА КРАЮ НЕ МАЕ.**

Аднак мала хто ведае, што вышэйпамянёная дата ўсё ж "засвяцілася" і ў гісторыі нашага нацыянальнага войска. Акурат 23 лютага 1944г., гэта значыць 60 гадоў таму, Генеральны камісар Беларусі Курт фон Готберг падпісаў загад аб стварэнні Беларускай Краёвай Абароны (БКА) – нацыянальнай вайсковай фармацыі, прызванай змагацца з партызаншчынай і бальшавізмам.

Спачатку БКА мелася быць добраахвотніцкай фармацыяй, але прэзідэнт Беларускай Цэнтральнай Рады (орган самакіравання – Л.Ч.) Радаслаў Астроўскі пераканаў немцаў абвясціць агульную мабілізацыю. Гэты факт даволі спрэчны. Радаславу Астроўскаму часта ўпікаецца, што нібыта так ён хацеў выслужыцца перад немцамі, толькі і ўсяго. Насамрэч, не ўсё так проста.

Астроўскі меў перад сабой ясную мэту – вольную Беларусь, хай сабе і "пад апекай" Нямеччыны. У гэтых умовах абавязковая мабілізацыя была важнай палітычнай перамогай. Справа ў тым, што, паводле міжнародных законаў, Нямеччына не магла прымусова мабілізоўваць у сваё войска насельніцтва акупаваных тэрыторый. І нездарма, нягледзячы на тое, што загад аб стварэнні БКА падпісваў фон Готберг, загад аб агульнай мабілізацыі ў БКА (6 сакавіка 1944г.) падпісаў сам Радаслаў Астроўскі. De jure гэта азначала, што новастворанае беларускае войска робіцца саюзнікам нямецкага, а не ўліваецца ў яго склад (што хутчэй за ўсё адбылося б пры добраахвотнай мабілізацыі).

Агулам да канца сакавіка было ўтворана 39 батальёнаў стральцоў і 6 батальёнаў сапёраў (усяго 21 628 чалавек). Яны выкарыстоўваліся ў асноўным для аховы камунікацый і барацьбы з партызанамі і не пасылаліся на фронт.

З цягам часу рабілася ўсё больш відавочным, што немцы прайграюць вайну. Лінія фронту набліжалася. Дзеля гэтага некаторыя жаўнеры, жадаючы абяліць сябе і не стаць ахвярамі паваенных рэпрэсій, пачалі пераходзіць да партызан. Тая частка салдат, якая не хацела жыць у "савецкім раі" і жадала прадоўжыць барацьбу супраць бальшавізму, адступіла разам з нямецкім войскам.

Бліжэй да канца вайны, зразумеўшы, што Гітлер прайграе, дзеячы Беларускай Цэнтральнай Рады пачынаюць пераарыентацыю на Альянс, спадзеючыся, што пасля перамогі над Германіяй Англія і Злучаныя Штаты абвесцяць вайну СССР. Астроўскі з паплечнікамі чыняць розныя перашкоды, імкнучыся не дапусціць, каб беларусы трацілі жыцці ў барацьбе, якая пачынае рабіцца бессэнсоўнай. Ды і самі беларускія салдаты пры першай магчымасці імкнуцца перайсці на бок англа-амерыканскіх войскаў. Некаторыя з іх зноў узялі ўдзел у вайне, але ўжо на баку Альянсу (звычайна ў складзе польскіх фармацый).



**Выпускнікі камандзірскіх курсаў БКА падчас урачыстага маршу ля Менскага Беларускага тэатра (цяпер Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Я. Купалы). Чэрвень 1944г.**

Пасля заканчэння вайны БКА, як згуртаванне былых удзельнікаў II Сусветнай вайны, цалкам уліваецца ў Беларускі вызвольны фронт – агульнабеларускую змагарную арганізацыю на чужыне.

У цяперашні час можна па-рознаму ставіцца да тых, хто супрацоўнічаў з немцамі ці змагаўся на іх баку. І сёння мы чытаем кнігі, выпушчаныя за савецкім часам, глядзім кінафільмы, дзе ўсё падзелена на "чорнае" і "белае", "нашых" і "фашыстаў". Між тым, трэба ўсведамляць, што за Саветамі гістарыяграфія была не навукай, а хутчэй палітыкай, абернутай у мінулае. Значэнне некаторых падзей перабольшвалася, некаторыя факты замоўчваліся, некаторыя – свядома скажаліся ці фальсіфікаваліся. Аб нечым мы даведваемся толькі цяпер. Нельга адмаўляць таго, што сярод "калабарантаў" былі людзі, якія любілі свой край, жадалі яму лепшай долі і намагаліся нават ва ўмовах акупацыі штосьці зрабіць для яго. Перад няпростым выбарам: гітлераўская Нямеччына ці сталінскі СССР з розных прычын яны выбралі Нямеччыну. Наўрадці мы можам іх за гэта асуджаць. Тыя ж, хто ваяваў у шэрагах БКА, таксама абаранялі свой Край ад ворага, бо бальшавізм быў ворагам беларускага народа. Дзякуй ім за гэта.

А нас усіх – з Днём абаронцы Айчыны!




**Маладыя вайскоўцы БКА перад адпраўкай на захад. Лета 1944.**

**Л. Чарэўскі**

## ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР

### 14 ЛЮТАГА

14 лютага 1907 г. нарадзіўся беларускі паэт **Алесь Звонак**. Гэта рэдкі выпадак, калі дзеяч найноўшай беларускай культуры прыйшоў на свет у цяперашняй сталіцы Беларусі – Менску.

Затое лёс у паэта Звонка тыповы. У 1936-м ён быў арыштаваны і на 10 гадоў высланы ў Магадан. Вярнуўся ён ажно праз 20 гадоў. Можна сабе ўявіць, як гэта было няпроста для ўчарашняга ворага народа — вярнуцца.

Паэтам няпроста было не толькі за Сталінам. Наогул, у народзе распаўсюджана думка, што пісаць вершы — амаль тое самае, што гультайнічаць. Чаму ж тады дастаецца паэтам заўсёды ад усялякіх палітычных рэжымаў? Можа таму, што дыктатура знішчае найперш свабоду. А менавіта пішучы вершы, чалавек пачуваецца найбольш вольным.

### 15 ЛЮТАГА

15 лютага — **Грамніцы** або **Стрэчанне**. Земляробчае свята сустрэчы зімы і лета. Першая назва, як мяркуюць, пайшла ад паганскага бога Грамаўніка, які ўтварае вясновыя навальніцы і дажджы.

Пасля гэтага дня зімовая ўлада мусіла сканчацца. Людзі казалі: "На грамніцы – паўзіміцы" або "Як прыйдуць Грамніцы – скідай рукавіцы". Менавіта так гэтае свята называлася і адзначалася ў беларускай дахрысціянскай традыцыі. А другая назва – Стрэчанне – паходзіць ад царкоўнага "Срэцення", якое народ перакруціў на простае і зразумелае.

А ў нас сёння Стрэчанне, Стрэчанне,
Зіма з летам стрэлася, стрэлася,
Лета зіму піхнула, піхнула
І ножачку звіхнула, звіхнула.
Зіма пайшла плачучы, плачучы,
Лета пайшло скачучы, скачучы.

### 16 ЛЮТАГА



16 лютага 1757 г. у вёсцы Скокі цяперашняга Берасцейскага раёну нарадзіўся **Юльян Нямцэвіч** – слынны змагар і пісьменнік, ад'ютант Тадэвуша Касцюшкі.

¨н вучыўся ў Берасцейскім езуіцкім калегіуме, пасля – у Варшаўскім кадэцкім корпусе. У часе антырасейскага паўстання 1794 г. Нямцэвіч разам з Касцюшкам патрапіў у палон і быў зняволены ў Петрапаўлаўскай крэпасці. Пасля разам са сваім нязменным камандзірам Нямцэвіч выехаў на нейкі час у Амерыку.

Вярнуўшыся на Радзіму, ён браў удзел у паўстанні 1831г. Прызнацца, цяжкавата ўявіць сабе паўстанца, якому 74 гады.

Пасля паразы паўстання Нямцэвіч выязджае ў эміграцыю, дзе цалкам прысвячае сябе літаратурнай дзейнасці, на што Бог падарыў яму яшчэ 10 плённых гадоў. Апроч раманаў, камедый і патрыятычных песен Юльян Нямцэвіч пісаў яшчэ і мемуары, у якіх пераказваў сваё надзвычай багатае жыццё і распавядаў пра прыгажосць сваёй Радзімы – Беларусі.

**Гістарычны сектар**

## ЗАСПЯВАЕМ!

«ДЗЕДЗІЧ» ПРАЦЯГВАЕ ПУБЛІКАВАЦЬ ТЭКСТЫ НАЙБОЛЬШ ПАПУЛЯРНЫХ БЕЛАРУСКІХ ПЕСЕНЬ ДЛЯ ТЫХ, ХТО ЛЮБІЦЬ АДПАЧЫВАЦЬ ПАД ЗВОН ГІТАРЫ. А ТЫМ, ХТО ЖАДАЕ НАБЫЦЬ БЕЛАРУСКУЮ МУЗЫКУ, РАІМ ТЭЛЕФАНАВАЦЬ У РЭДАКЦЫЮ.

# РАЗВІТАННЕ З РАДЗІМАЙ

З альбому «Я нарадзіўся тут»

(Акорды падабраны Кацяй Жалабковіч)

```
Em
Сонца праменне стужкай вузкай
 E7          Am
Ператкала помны вечар.
  H7                Em
Край бацькоўскі, край мой беларускі,
Am              H7
Я табе кажу на развітанне:
     Em
«Да спаткання, да сустрэчы».
Am
Я табе кажу на развітанне:
        H7          Em
«Да спаткання, да сустрэчы».
```

Водар закінутага саду,
Ў небе зорка Мілавіца,
Таямніцы паркавых прысадаў
Пэўна, неаднойчы на чужыне
Будуць мроіцца і сніцца.
Пэўна, неаднойчы на чужыне
Будуць мроіцца і сніцца.

```
Прыпеў:
  Em              H7
Зноў залунае наш штандар,
                 G
Палыхне ўначы пажар,
             D
І паходнаю трубой
                 G         H7
Зноў пакліча нас з табой на мужны бой
  Em       H7
Мая Радзіма - край адзіны.
 Em
Да яго з выгнання
  H7           Em  H7  Em
Шлях вяртання – шлях змагання.
```

Ростань на ростанях краіны.
Раніць думкі шлях абраны.
Прагне сэрца ў родныя мясціны
І Радзімы вобраз ажывае
Растрывожанаю ранай.
І Радзімы вобраз ажывае
Растрывожанаю ранай.

Дахі мястэчак, стрэхі вёсак,
Вежы замкаў і палацаў,
Гонкіх храмаў звонкі адгалосак
Клічуць да сябе,
Бо немагчыма з гэтым краем развітацца.
Клічуць да сябе,
Бо немагчыма з гэтым краем развітацца.

```
Прыпеў.
 G        D
Воі прагнуць волі,
 G        D
Воля – свет і доля.
  G       D
Броні звон ды коні,
 G        H7
Коні- кліч «Пагоні».
  Em       H7
Крочым з багны ночы,
   Em       H7
З ночы шлях прарочы.
```

Прыпеў.

Золак, ахутаны туманам,
Далягляды ў барвах бэзу.
І гучаць нябёсныя арганы,
І жывуць у сэрцы,
І зліваюцца у гуках паланэзу.
І жывуць у сэрцы,
І зліваюцца у гуках паланэзу.

# КРУЦІ НЕ КРУЦІ...

**ЧАРГОВАЯ ХВАЛЯ НАСТУПУ НА БЕЛАРУСКАСЦЬ У НАШАЙ ДЗЯРЖАВЕ ВЫЛІЛАСЯ Ў АКТ ВЫСЯЛЕННЯ ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ З СЯДЗІБЫ, ЯКУЮ ЯНО ЗАЙМАЕ З 1989Г. (г. МЕНСК, ВУЛ. РУМЯНЦАВА, 13). НЕВЯДОМА, ЧЫМ СКОНЧЫЦЦА ГЭТЫ АКТ АГРЭСІІ З БОКУ ЎЛАДАЎ, АЛЕ МЫ, МОЛАДЗЬ БЕРАСЦЯ, СПАДЗЯЕМСЯ НА НАЙЛЕПШЫ ВЫНІК ДЛЯ ТАВАРЫСТВА.**

Многія беларусы жывуць і не бачаць, што адбываецца ў нашай краіне; па-за іх ўвагай застаецца барацьба за нацыянальную культуру, нашу, хоць для многіх (толькі пашпартных) беларусаў і не родную беларускую мову, якую трэба вывучаць амаль як замежную. І барацьба гэтая не на карысць людзей, што, нягледзячы на палітыку дзяржавы, не загубілі ў сабе беларускасць. Бо ўсялякае праяўленне нацыянальнасці жорстка караецца дзеючымі ўладамі. Ужо мала засталося тых аптымістаў (нават на беларскім аддзяленні філалагічнага факультэта), што паміж сабой гутараць на сваёй роднай мове – пераважае расейская; ідучы па калідоры ў час перапынку, складаецца ўражанне, што, нягледзячы на расклад, дзе чорным атрамантам на бялюткай паперы адзначана кожная група беларускага аддзялення, тут вучыцца выключна рускі філфак...

Шматгадовая моўная палітыка савецкай дзяржавы, якую працягвае існуючая ўлада, зрабіла сваю справу. У свядомасці людзей выпрацавалася пэўная рэфлексія – адзіная мова зносін паміж людзьмі нашай краіны – расейская, а нацыянальная мова – так, падвопытны пацук для навукоўцаў. Вось і баімся мы загаварыць па-чалавечы, бо адразу атрымаем ад нейкага невука, у якога замест галаўнога мозгу – церуха, найменне нацыяналіста. У такім выпадку, мабыць, трэба ўсіх расейцаў назваць нацыяналістамі – яны ж гавораць на мове сваёй дзяржавы, этнасу (хаця спрэчна і тое, што яны гавораць на сваёй этнічнай мове). А як быць з палякамі, немцамі і інш.? Таксама, відаць, трэба акляйміць нацыяналістамі? Людзей падобнага тыпу (у сэнсе тых, хто пужае беларусаў страшылкамі пра злых нацыяналістаў і расказвае казкі пра добрага бацюшку-цара) у савецкай дзяржаве любоўна называлі "маса" (і сапраўды, трапнае вызначэнне, бо які можа быць інтэлект у масы?). Маса – гэта статак, які мае толькі сілу. Маса можа паглынуць і знішчыць, больш нічога дзейснага ад яе дабіцца нельга.

На жаль, мы так абруселі, што нават сярод студэнтаў-філолагаў, будучых выкладчыкаў мовы і літаратуры, вольна размаўляць на беларускай мове могуць адзінкі, а астатнія нават і не спрабуюць авалодаць гутарковым узроўнем мовы.

Паступова гінем (дакладней, знішчаюць), паступова, вельмі паступова, а мы і рады (тое ж, што зразаць чалавеку пазногці, потым пальцы, а затым рукі, ламаць ногі па калена... і далей, прыгаворваючы: "Так і трэба даражэнькі, так і трэба, і гэта зусім не балюча...").

У заключным слове хацелася б павіншаваць усіх, бо калі мы будзем рухацца па-ранейшаму сацыялістычна-ўпартымі тэмпамі камуністычна-ўдарнага знішчэння нашай роднай мовы, то ў хуткім часе, шаноўныя філолагі, беларусазнаўцы і будучыя выкладчыкі, вашая спецыяльнасць у Рэспубліцы Беларусь нікому не будзе патрэбна.

**P.S.** Аб якасці моўнай палітыкі ўлады яскрава сведчаць выказванні яе кіраўніка А.Лукашэнкі:

– Язык может уничтожить и разрушить только дурак, а я не хотел бы быть таким дураком.

– Люди, которые говорят на белорусском языке, не могут делать ничего, кроме как разговаривать на белорусском языке, потому что по-белорусски нельзя выразить что-то большое. Белорусский язык – бедный язык. В мире существуют только два великих языка – русский и английский. (Снежань 1994г.)

– Найдите мне хоть одну фразу, где я пренебрежительно отозвался о белорусском языке. Найдите и покажите. Не найдете. Я уплачу миллион долларов. Найдите и мне пришлите. Никогда не было этого. Это опять выдумки оппозиции. ("Независимая газета", 29 мая 1997г.).

**Гаспадар**

# ПЯРЭПАЛАХ У ЦЯЛЯТНІКУ

> *Я стаміўся гаварыць тыя самыя словы…*
> **В.Шалкевіч**

АДНОЙЧЫ ПА ДАРОЗЕ ДАДОМУ МАЕ ПРЫЕМНЫЯ ДУМКІ АБ ЗАЎТРАШНІМ ЗАЛІКУ ПЕРАПЫНІЛА АДБОРНАЯ ЛАЯНКА, АДЧУВАЛАСЯ, АДСТАЎНОГА ПРАПАРШЧЫКА. ПРАФЕСІЯНАЛЬНАЯ ЦІКАЎНАСЦЬ ПЕРАМАГЛА НАВАТ ПІЛЬНУЮ ПАТРЭБУ ЯК НАЙХУТЧЭЙ БЫЦЬ ДОМА, І Я СТАЎ ШУКАЦЬ КРЫНІЦУ ТАКІХ БЛІСКУЧЫХ ВЕДАЎ СУЧАСНАЙ ЭЗОПАВАЙ МОВЫ, БО ЗА ХВІЛІНУ СТАЛА ЗРАЗУМЕЛА, ШТО МАЕ ДВАЦЦАЦІГАДОВЫЯ НАЗАПАШВАННІ Ў ПАРАЎНАННІ З БАГАЖОМ ДЗЯДЗЬКІ ПРАПАРШЧЫКА – ПРОСТА НІШТО.

Зрэшты, пабачыўшы прычыну душэўных пакутаў небаракі, я цудоўным чынам адкрыў у сабе здольнасць дадаць да маналогу вайскоўца нешта яшчэ нечуванае. Прычына была вельмі простая: на капоце дзядзькавага "Бумара" зіхацела мэталёвым бляскам свежае надрапаванне: "БСМ + БПСМ = БРСМ!"

Зрэшты, можна толькі радавацца з гэтай нагоды ўз'яднання двух збегаў зычных. Нарэшце нашая самая перадавая ў свеце моладзь атрымала мажлівасць не хістацца ў выбары прыстанку для рэалізацыі сваіх моладзевых намаганняў. Дарэчы, каб яна яшчэ больш не хісталася, воляю беларускага Мао на плечы (на жаль, не на галаву за яе адсутнасцю) культасветработнікаў ускладзены пачэсны абавязак прымусова запрашаць усіх "чэсных мальчыкаў" і "прастых дзевачак" насіць прыгожанькі значак з чатырма літаркамі. Напрыклад, у адным з цялятнікаў калгаса "Берасце" з абавязкам загоншчыка бліскуча спраўляецца заслужаная даярка народных сродкаў Святлана Тазік.

Застаецца толькі прапанаваць не спыняцца на дасягнутым. Напрыклад, можна выкарыстаць вопыт камсамольскай сэксуальнай рэвалюцыі 1922-1925 гадоў. Тады адмысловую патрэбу любога камсамольца павінна была задаволіць кожная камсамолка пасля падпісання сакратаром райкома адпаведнай заявы. Праўда, прымаліся заявы толькі тых, хто выканаў план па здачы металалому, меў значак "ГТО" і праштудзіраваў несмяротны твор Надзеі Крупскай "О половом воспитании коммунистической молодёжи". Зрэшты, у варунках сучаснай Беларусі можна было б замяніць гэтыя драконаўскія меры на праяву адданасці і чэснай любові да Таты і Мамы Таты.

Ці спыніцца запушчаны рухавік, вырашаць нам з вамі.

**Сяргей ГАЎРЫЛЕНКА**

## ПОШТА ДЗЕДЗІЧА



*Паважаная рэдакцыя!*

*Звяртаецца да вас Ляшчук Мікалай Барысавіч, 1920 г.н. Пішу я да вас вось чаму. Калі вы былі яшчэ малыя, то мы хадзілі на работу і мала часу было на расказы. Зараз усё змянілася: часу маем шмат, і шмат чаго ўспамінаецца, асабліва дзяцінства. Прачнешся ноччу і столькі ўсяго перадумаеш, што і самому не верыцца. Можна было б шмат чаго вам расказаць, але ж зараз вышла наадварот: у вас часу мала.*

*У беларускую школу я не хадзіў, таму што пры паляках не было беларускамоўных школ. З гэтай прычыны беларускай мове мяне вучылі дзядзькі, браты і, канешне ж, маці. З беларускай музыкай і культурай я пазнаёміўся на "сходках", якія праводзіліся ў хатах больш заможных гаспадароў.*

*Дасылаю вам некалькі беларускіх песень, якія ўжо зусім забыліся і нідзе не спяваюцца.*

*Жадаю поспеху ў вашай працы!*

**Ішоў злодзей па дарозе...**

Ішоў злодзей па дарозе,
Спадабаў кабылку ў возе,
Ўзяў кабылку з хамутом,
Пакінуў бабу з батагом.

А як баба ўжо прачнулась,
Туды-сюды аглянулась,
Сваім вочам не ўвярае:
Па аглоблях паганяе.

Уха-ха-ха!

Ой ты дзеду, ты мой дзеду,
Чым да дому я паеду,
А дзед бабу закладае
Баба задам падкідае.

Уха-ха-ха!

Тпру! Стой! Мая міла.
Ого-го!
Ледзь ты воза не разбіла.
Ого-го!

**Вязу пану масла...**

Вязу пану масла, сыры,
Грошай трэба недзе стырыць,
Пан, бач, смачна есці хоча,
Ты ж глядзі: жывот аж квокча.

Ад світання да змяркання
Ўсё працуй, усё цягайся,
Толькі бульбай аддувайся!

Бульба сёння,
Бульба ўчора,
Бульба смажана, пячона,
З бульбы мука,
З бульбы каша,
Эх, праклята доля наша!

**З павагай, Мікалай ЛЯШЧУК**

## СМАЧНА ЕСЦІ!

# ЛАВІСЯ РЫБКА ВЯЛІКАЯ І МАЛЕНЬКАЯ

СЁННЯ МЫ ЗНАЁМІМ ВАС СА СТРАВАМІ, ЯКІЯ ГАТУЮЦЦА З РЫБЫ. РЫБА – З ДАЎНІХ ЧАСОЎ ПАПУЛЯРНЫ ПРАДУКТ У ГАСПАДАРЦЫ БЕЛАРУСАЎ. СКРОЗЬ ПРАНІЗАНАЯ РЭКАМІ, КРАІНА ЛЯСОЎ І БАЛОТ ЗАЎЖДЫ БЫЛА БАГАТАЯ НА РЫБУ. І НАШЫ ПРОДКІ, НАТУРАЛЬНА, АКТЫЎНА, АЛЕ І АШЧАДНА ВЫКАРЫСТОЎВАЛІ БАГАЦЦІ СВАЁЙ ЗЯМЛІ І ВЕДАЛІ ШМАТ РЭЦЭПТАЎ ПРЫГАТАВАННЯ РЫБЫ.

### ГАЛКІ РЫБНЫЯ

*800 г рыбы, 2-3 лустачкі чэрствай булкі, 2 цыбуліны, 1 ст. лыжка алею, 1 морква, 0,5 ч. лыжкі цукру, соль, перац.*

Рыбу некалькіх гатункаў (траску, скумбрыю, стаўрыду і інш.) ачысціць, выпатрашыць, прамыць. Мякаць рыбы аддзяліць ад касцей, прапусціць праз мясарубку два разы, другі раз разам з цыбуляй і булкай, замочанай у вадзе або малацэ. Дадаць яйка, алей, соль, перац, добра вымешаць. З атрыманай масы сфармаваць галкі.

На дно рондаля пакласці рыбныя галовы, плаўнікі, косткі, нарэзаную кружкамі моркву, шалупінне ад цыбулі, соль, цукар, уліць ваду (каля 0,75 л). Калі вада закіпіць, апусціць у яе галкі і варыць на слабым агні 1 гадзіну.

Падаць разам з соўсам, у якім гатаваліся галкі (можна гарачымі і халоднымі).

### РЫБА, ТУШАНАЯ З ЯБЛЫКАМІ

*600 г рыбы, 5 яблыкаў, 1 цыбуліна, 1 шклянка смятаны, 1 ч. лыжка тлушчу, соль, перац.*

Падрыхтаваную рыбу (карп, траска, камбала і інш.) нарэзаць кавалкамі, ачышчаныя ад скуркі і асяродка яблыкі - скрылькамі, цыбулю нашаткаваць. На патэльню, змазаную тлушчам, пакласці кавалкі рыбы, на яе - яблыкі, зверху - цыбулю, дадаць соль, перац, уліць невялікую колькасць вады і патушыць пад накрыўкай.

Калі рыба будзе гатова, выняць яе. Яблыкі і цыбулю працерці праз друшляк, уліць смятану і давесці да кіпення.

Падаць рыбу разам з атрыманым соусам.

### КАРП ФАРШЫРАВАНЫ

*1 карп (1 кг), 2-3 лустачкі чэрствай булкі, 3 цыбуліны, 0,5 ч. лыжкі цукру, 1 яйка, 1 ст. лыжка алею, 1 морква, 0,5 бурака, соль, перац.*

Ачышчаную, выпатрашаную і прамытую рыбу нарэзаць кавалкамі. Вузкім вострым нажом выразаць з іх мякаць такім чынам, каб не пашкодзіць скуру і пакінуць хрыбтовую костку. Мякаць рыбы разам з замочанай у вадзе або малацэ булкай, дзвюма цыбулінамі прапусціць праз мясарубку. Дадаць яйка, соль, перац, цукар, алей, добра перамяшаць, потым узбіць лыжкай. Атрыманым фаршам запоўніць кавалкі рыбы, у тым ліку і галаву (пад жаберныя шчыліны).

На дно рондаля пакласці сырыя ачышчаныя і нарэзаныя скрылькамі буракі, моркву, цыбулю, пасыпаць соллю і перцам, зверху пакласці кавалкі рыбы, уліць халодную ваду (прыкладна 2/3 аб'ёму), каб яна амаль пакрыла рыбу, і варыць не менш за 2 гадзіны.

Падаць ахаладжанай разам з агароднінай, з якой гатавалася рыба.

### ЗАПЯКАНКА З РЫБЫ

*500 г рыбы (карп, лінь), 500 г бульбы, 3-4 ст. лыжкі алею, 0,5 шклянкі смятаны, 1 цыбуліна, 1 ст. лыжка мукі, соль, перац, зеляніна.*

Падрыхтаваную рыбу парэзаць на кавалкі, пасыпаць соллю, перцам, укачаць у муку і абсмажыць на алеі з абодвух бакоў. Памытую бульбу зварыць, абабраць, змяльчыць на буйной тарцы. Асобна абсмажыць дробна нарэзаную цыбулю.

У жароўню, змазаную алеем, пакласці палову падрыхтаванай бульбы, на яе – кавалкі рыбы, пасыпаць яе цыбуляй, зверху – зноў слой бульбы. Усё паліць смятанай і рэштай алею. Запякаць у духоўцы 30 хвілін.

Пры падачы на стол запяканку парэзаць на кавалкі, пасыпаць дробна нарэзаным кропам.

### РЫБА Ў ТАМАТНЫМ МАРЫНАДЗЕ

*800 г рыбы (любой), 2 ст. лыжкі мукі, 2 цыбуліны, 2 морквы, 2 ст. лыжкі тамату-пюрэ, 0,5 шклянкі алею, соль, перац, лаўровы ліст.*

Ачышчаную і прамытую рыбу нарэзаць кавалкамі, пасыпаць соллю, перцам, укачаць у муку, абсмажыць на алеі з абодвух бакоў.

Цыбулю дробна нарэзаць, моркву змяльчыць на буйной тарцы, разам абсмажыць на алеі, дадаць тамат-пюрэ, соль, перац, лаўровы ліст, уліць трошкі вады і тушыць 5-6 хвілін. Пакласці ў марынад кавалкі смажанай рыбы і добра прагрэць.

Рыбу ў таматным марынадзе можна падаць як у гарачым, так і ў халодным выглядзе.

### КАРП, ЗАПЕЧАНЫ З МАЯНЭЗАМ

*700 г карпу, 1-2 цыбуліны, 0,5 шклянкі маянэзу, соль, перац.*

Падрыхтаваную рыбу нарэзаць кавалкамі, пасаліць, папярчыць, выкласці на патэльню, паміж кавалкамі рыбы пакласці цыбулю, нарэзаную кружкамі.

Рыбу і цыбулю густа абмазаць маянэзам і запякаць у гарачай духоўцы 20-30 хвілін.

Запячы з маянэзам можна і іншую рыбу.

### КАРП З НАЧЫНКАЙ З ГРЭЦКАЙ КАШЫ

*1 карп (800 г), 2 ст. лыжкі грэцкіх круп, 1 цыбуліна, 1 яйка, 1 ч. лыжка сметанковага масла, 50 г смятаны, соль, перац.*

Ачышчаную, выпатрашаную і вымытую рыбіну пасаліць унутры і зверху. Зварыць рассыпістую грэцкую кашу, дадаць абсмажаную цыбулю, па смаку соль і перац, убіць яйка, перамяшаць. Кашай начыніць рыбіну (у тым ліку і галаву), выкласці яе ў пасудзіну адпаведнай формы, уліць смятану і трошкі вады. Тушыць у духоўцы на працягу 45-50 хвілін.

### САСІСКІ РЫБНЫЯ

*500 г рыбы (філе), 2 яйкі, 1-2 лустачкі белага хлеба, 0,25 шклянкі малака, алей для смажання, 1 цыбуліна, 2 ст. лыжкі мукі, 2 ст. лыжкі паніровачных сухароў, 1 ст. лыжка сметанковага масла, соль, перац.*

Філе рыбы разам з замочаным у малацэ і адціснутым белым хлебам і цыбуляй двойчы прапусціць праз мясарубку. Дадаць узбітае яйка, соль, перац, старанна перамяшаць.

З рыбнай масы сфармаваць сасіскі, кожную ўкачаць у муку, абмакнуць у яйка, затым укачаць у сухары. Смажыць у вялікай колькасці алею.

Пры падачы на стол паліць распушчаным сметанковым маслам.

**Марыя ЕСІНА**

## ПОШТА ДЗЕДЗІЧА

### ДУМАЙ, А НЕ МЕЧТАЙ

***Нет ничего проще, чем плакаться в жилетку, горько рыдать после неудач, наслаждаясь своим горем, сетовать на судьбу, предаваясь мечтам. Ничего не делать, не предпринимать, а затем утверждать, что не везёт. А после заявлять, что слишком мал человек и ничего от него не зависит в жизни.***

*Что от нас зависит в этой жизни? Ничего. Даже место, которое ты займёшь в троллейбусе зависит не от того, на каком месте на остановке ты встанешь, даже в первых рядах, а от того, на каком расстоянии от тебя нажмёт на тормоз водитель и, соответственно, как далеко от тебя будут двери.*

*Но упорным и сильным везёт. И ничего странного, в принципе. Каждому предоставлено судьбой, жизнью некое количество шансов добиться успеха. Упорный делает ставку на каждый из номеров. Постоянно делает новые попытки преуспеть, настоять на своём. Ленивый и слабый не шевелится. Иногда предпримет усилие и, если угадает счастливый номер, то именно про него говорят, что ему повезло. А упорный постоянно трудится и именно своими стараниями и усилиями зарабатывает успех.*

*Причём успех в своих делах, в достижении своих целей. И эти цели, равно как и успех, каждый определяет для себя сам. И проблемы у каждого свои. Не надо думать, что у остальных их меньше, или же они проще. Проще не заметить своё, чем чужое. Но отказ от дел может быть одинаков, даже у президента.*

*Как было бы здорово сделаться главой государства. Представь: сам всегда определяешь своё время. Захотел поесть – пожалуйста. Захотел перенести обед на час – запросто, а суп всё равно будет тёплым. Захотел пораньше – нет вопросов, всё готово. Накрыто. Компанию за столом выбираешь сам. Выпить охота – кто тебе сделает замечание? Хочешь подремать после еды – будьте любезны, диван готов. То есть человек сам себе полный хозяин. И никто ему не указ. Он даже встречу с главой другого государства может отменить. И кто его покритикует? Всегда найдётся объяснение исходя из государственной целесообразности.*

*А теперь скажите: чем жизнь любого свободного человека отличается от жизни главы государства? Он ведь тоже может всех послать.*

***Дмитрий***



Фота: ByMedia.net

## ПОШТА ДЗЕДЗІЧА

### ВОКРУГ НАС

***Алёнушка была доброй и выручила своего братца, расколдовала его, стал он снова человеком. И стали они жить-поживать и резать овечек и козлят, которые не имели столь могущественных связей, чтобы превратиться в людей...***

*Людское отношение к своей планете похоже на поведение паразита – забрать всё, что можно, и тем самым уничтожить хозяина. А что станет в конце концов с паразитом? Если он не найдёт нового хозяина, то исчезнет.*

*"Земля изначально была горячим куском вещества, потом стала тёплой, и если она в конце концов остынет – то чего её жалеть?" – наверняка так мыслит человечество. – "Надо объесть, ободрать, вытянуть все соки из глубин, а потом тучей прожорливой мошкары перебраться на другие лакомые планеты." Вот и вся подоплёка освоения пространства. Вот для этого с разведочными целями и осуществляются робкие пока вылазки человека в космос. Наверняка этого – то есть нашествия паразита – и опасаются инопланетяне, если они есть, конечно.*

*Под контролем человека многие факторы, влияющие на окружающую среду и "условия жизни" обитателей земли. Элементарный пример: для своих целей люди хоть как-то очищают, фильтруют ими же отравленную воду, а что остаётся животным и рыбам? Они вынуждены пользоваться водой, быть может грязнее, чем их шкура. В их распоряжении нет другой воды, чем та, которую предоставляет в их пользование человек.*

*А что делает человек? Подменяет настоящее на искуственное. Пейзажи заменяет на картины, фотографии, киноленты. Леса вырубил, животных перебил, зато может пользоваться их изображением – назвать машину "Ягуаром", фирму – "Пумой". Вместо фруктового сока – суррогаты, родниковой воды – отфильтрованная гадость. Еда, которую человек выращивает, содержит либо химикаты, либо мутации генов. Даже общение с себе подобным человек меняет на общение с компьютером. Скоро и жизнь самого человека превратится в фикцию, иллюзию.*

*И Вам решать, быть ли придатком машины, видеть только образы и иллюзии или же общаться с себе подобным в реальной жизни.*

***Дмитрий***

## УВАГА!!!

**БАМГА "Сузор'е" абвяшчае дадатковы набор карэспандэнтаў у склад рэдакцыі ІАБ "Дзедзіч"**

**Студэнтаў, вучняў старэйшых класаў і ўсіх, хто жадае:**

**– Выказаць свае думкі,**
**– Навучыцца пісаць артыкулы,**
**– Зірнуць на акаляючы свет вокам журналіста,**
**– Стаць ля вытокаў стварэння новай моладзевай газеты,**

**просім звязацца з намі па тэл.: 20-57-41 з 18$^{00}$ да 21$^{00}$.**
**Маб.: (029) 660-57-41 (Дзмітрый), (029) 725-15-39 (Андрусь).**
**Таксама запрашаем да супрацоўніцтва мастакоў, карыкатурыстаў, фатографаў.**

БРЭСЦКАЯ ГАРАДСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ

**ПАРТЫЯ БНФ**

**распачынае новую агульнагарадскую кампанію "Разам за еўрапейскі дабрабыт".**

**СТАНЬ СЯБРАМ ПАРТЫІ БНФ!**

**Разам мы:**

- Пабудуем сучасную эфектыўную гаспадарку;
- Усталюем парадак і вяршэнства Закона;
- Адстаім незалежнасць нашай Радзімы;
- Знішчым усеўладдзе і карупцыю чынавенства.

**СТАНЬ СЯБРАМ ПАРТЫІ БНФ!**

**Ты зможаш:**

- Атрымаць кваліфікаваную прававую дапамогу ў складаных жыццёвых сітуацыях;
- Прайсці курсы палітычнай і грамадзянскай адукацыі ў Беларусі і за мяжой;
- Зрабіць кар'еру адукаванага і перспектыўнага палітыка;
- Навязаць кантакты з нашымі партнёрамі ў краінах Еўропы;
- Знайсці новых сяброў, з карысцю для сябе і для Бацькаўшчыны праводзіць вольны час.

**СТАНЬ СЯБРАМ ПАРТЫІ БНФ,** каб шчыра казаць сваім дзецям і ўнукам: "Я зрабіў усё, каб ваша жыццё было шчаслівым"!

**Як стаць сябрам партыі БНФ?**
**Тэлефануй: 25-70-55; (029) 641-20-98.**

## АБ'ЯВЫ

**Рэдакцыя бюлетэня "Дзедзіч" шукае распаўсюджвальнікаў выдання ў навучальных установах Берасця і вобласці.**
**Тэл. (0162) 20-57-41.**

**Рэдакцыя бюлетэня «Дзедзіч» запрашае да супрацоўніцтва карэспандэнтаў з Берасця і гарадоў вобласці.**
**Калі вы жадаеце выказаць свае думкі на нашых старонках, тэлефануйце:**
**(0162) 20-57-41.**

АБ'ЯВЫ

# БІБЛІЯТЭКА ДЛЯ МОЛАДЗЕВЫХ НДА

У памяшканні БАМГА "Сузор'е" адкрылася бібліятэка НДА для прадстаўнікоў моладзевых арганізацый Берасцейшчыны і проста ініцыятыўных людзей. Яна змяшчае кнігі і дапаможнікі па арганізацыі дзейнасці грамадскіх арганізацый.

Карысную літаратуру па рэгістрацыі НДА, арганізацыі справаводства, пошуку фінансавання, працы з валанцёрамі, Public Relations у НДА і шмат-шмат іншай цікавай інфармацыі можна знайсці, звярнуўшыся ў БАМГА "Сузор'е".

Бібліятэка ўтрымлівае таксама літаратуру па наступных раздзелах:

– Выбары (арганізацыя выбарчых кампаніяў, агітацыя, назіранне);

– СМІ (рэгістрацыя і дзейнасць газет, рэкламная дзейнасць, нарматыўна-прававыя акты);

– Правы чалавека (метадычныя дапаможнікі, маніторынг парушэнняў правоў чалавека на Беларусі, міжнародныя акты і інш.);

– Гісторыя Беларусі (навуковыя матэрыялы, падручнікі, папулярная літаратура);

– Мовазнаўства (слоўнікі, дапаможнікі для тых, хто вывучае беларускую мову);

– Бюлетэні, брашуры і часопісы НДА Берасцейшчыны і краіны;

– Замежная літаратура (слоўнікі, кнігі, часопісы, газеты на ангельскай, польскай, украінскай, літоўскай і латвійскай мовах; матэрыялы па краязнаўству суседніх (і не вельмі) краін на беларускай мове);

– Мастацкая літаратура (на беларускай і расейскай мовах).

Бібліятэка чакае наведвальнікаў штодня з $12^{00}$ да $16^{00}$ (акрамя суботы і нядзелі). Заходзьце, не пашкадуеце. Калі патрэбнай вам літаратуры няма (і такое можа здарыцца), супрацоўнікі бібліятэкі дапамогуць у яе пошуку.

**Dzedzich week-news**

# СТЫПЕНДЫІ ІМЯ ЛЕЙНА КІРКЛЭНДА НА 2004-2005 АКАДЭМІЧНЫ ГОД

Польска-Амерыканская Фундацыя Вольнасці аб'яўляе адкрыты конкурс для кандыдатаў з Украіны, Беларусі, Расіі (Калінінградская вобласць), Літвы, Славакіі, Малдовы і Грузіі на атрыманне стыпендыі імя Лейна Кіркләнда на 2004-2005 акадэмічны год.

Падрабязную інфармацыю аб Праграме і анкету для кандыдатаў можна атрымаць па Інтэрнету на вэб-старонках:

www.programkirklanda.engo.pl,

а таксама www.fulbright.edu.pl.

Валоданне польскай мовай з'яўляецца адным з крытэрыяў удзелу ў дадзенай праграме.

Апошні тэрмін падачы заявак — 15 сакавіка 2004.

**Dzedzich week-news**

# СТАЖЫРОЎКІ ДЛЯ ЖУРНАЛІСТАЎ У БЕРЛІНЕ

Праект "Journalisten International" дае магчымасць маладым (да 32 год) журналістам і студэнтам факультэтаў журналістыкі, што валодаюць нямецкай мовай, пазнаёміцца з медыйнай сістэмай Нямеччыны.

Праграма складаецца з тэарэтычных семінараў у Вольным Універсітэце Берліна (6 тыдняў), стажыроўкі ў рэдакцыях электронных і друкаваных медыяў (6 тыдняў) і тыднёвага падарожжа па Нямеччыне.

Удзельнікі атрымліваюць стыпендыю, кампенсацыю транспартных выдаткаў і жывуць у студэнцкім інтэрнаце.

Дадатковую інфармацыю і анкеты можна атрымаць на http://jil.fu-berlin.de.

Наступная праграма распачнецца 1 верасня 2004 года.

Апошні дзень падачы аплікацыйных дакументаў – 15 сакавіка 2004 года.

**КАНТАКТЫ:**
Deutscher Akademischer Austausch Dienst
Aufenstelle Moskau
Leninskij Prospekt 95a
117313 Moskau
Tel.: +7/095/ 132 23 11, 132 49 92
Fax: +7/095/ 132 49 88
Э-мэйл: daad@daad.ru
Сайт: http://www.daad.ru

**Dzedzich week-news**

# КАНТАКТУЙ З БМА!

Беларуская музыка на касетах і CD.
Толькі ў нас пастаянныя святочныя зніжкі!

Набудзь пяць дыскаў – шосты атрымаеш задарма!!! Магчыма дастаўка на дом.

Прапануем заробак распаўсюднікам у Менску і рэгіёнах.

Кантактуй з намі: 8 (0296) 49 08 88, pager: 211 85 85 аб. БМА.

220085, г. Менск, а/с 5, wital@tut.by, www.BMA.home.by.

# ПАВІНШУЙ СЯБРОЎ

Павіншуй сваіх знаёмых, сяброў, каханых пабеларуску і канешне ж беларускай песняй!

**Радыё РОКС.** Штодня з 13.00 да 14.00, з 21.00 да 22.00. Факс: 288-20-13, 269-09-27. Пошта: 220002, г. Менск, вул. Старажоўская, 8А. E-mail: musicbox@roks.com, radio@roks.com, www.roks.com.

**Радыё 1.** Штодня з 20.10 да 21.30. Паштоўка за месяц на адрас: г. Менск, вул. Чырвоная, 4 (праграма "Вітаем! Віншуем! Жадаем!").

**Фонд «Дзедзіч» шукае добраахвотніка**

## WEB-дызайнера

**(з сярэднім узроўнем валодання WEB-праграмаваннем), які б дапамагаў нам у абнаўленні і ўдасканаленні сайта арганізацыі: http//:dzedzich.vezha.unibel.by.**
**На жаль, мы не можам аплаціць гэтую працу, але каву, гарбату і добрую сяброўскую атмасферу гарантуем.**
**Тэл.: (029 )660-57-41.**

## Беларуская палічка запрашае

**Сябры! Запрашаем Вас наведаць буйнейшую беларускую электронную бібліятэку! Адрас "беларускай палічкі": www.knihi.com.**

Тут Вы знойдзеце творы беларускіх пісьменнікаў, паэзію, казкі, пераклады вядомых сусветных літаратараў, рэлігійную і філасофскую літаратуру, гістарычныя даследаванні і шмат іншага. Наведвайце нашую віртуальную бібліятэку часцей – мы абнаўляемся штодзённа.

**Усе пажаданні і прапановы чытачоў улічваюцца!**

## Шаноўны чытач!

**Каб зрабіць наш бюлетэнь больш цікавым і прывабным для цябе і тваіх сяброў, мы звяртаемся да цябе з просьбай адказаць на гэтае пытанне і даслаць адказ на адрас: 224000, г. Берасце, пр-т Машэрава, д. 39, кв.4.**

Будзем вельмі ўдзячныя за тваю дапамогу ў стварэнні цікавай сучаснай газеты, а для лянівых паведамляем, што сярод тых, хто дашле нам свае заўвагі, мы разыграем 3 аўдыёкасеты з музыкай беларускіх гуртоў.

Чаго не хапае на старонках "Дзедзіча", якую інфармацыю ты хацеў бы атрымліваць праз яго:

________________________________________
________________________________________
________________________________________
________________________________________
________________________________________
________________________________________

## Увага!

Працягваецца бясплатная падпіска

**на Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь "Дзедзіч" для асоб, што не жывуць у г. Берасці.**

Калі ты жадаеш атрымліваць яго больш стала і аператыўна, запоўні гэты купон і дашлі яго на адрас:

**224000, г.Берасце, пр-т Машэрава, д. 39, кв. 4.**

Чаму ты вырашыў падпісацца: ____________________
________________________________________

Прозвішча: [redacted]
Імя:
Імя па бацьку:
Паштовы адрас:

Тэлефон:

## ДАРЭЧЫ

У амерыканскім войску сержант распавядае свайму аддзяленю:

- У расейцаў ёсць такія войскі, "ВДВ", там на аднаго іхняга дваіх нашых трэба! Але гэта яшчэ нічога. ¨сць у іх марская пяхота, там на аднаго іхняга траіх нашых трэба! Але самае страшэннае - у іх ёсць войскі, "стройбат" называюцца, дык тым звярам увогуле зброю не даюць!

***

У Гарадзенскі заапарк прывезлі слана, якога выхоўвалі страусы. Калі яго доўга пужаць, то ў Гародні нарэшце з'явіцца метро.

***

- Ты даўно ведаеш гэтую дзяўчыну?
- Ды так сабе... Пару разоў.

***

Сядзіць мужык на папялішчы. Згарэла хата. І жонка. І дзеці. Сядзіць і плача.
Ідзе побач сусед:
- Што здарылася?!
- Ды вось, хата згарэла!
- Гэта ж трэба, якое гора! А жонка дзе?
- І жонка згарэла.
- Ой, якое гора! А дзеці дзе?
- І дзеці згарэлі.
- Які жах!!! Ну, а так, увогуле, як справы?

***

- Бонд, Джэймс Бонд...
- Пух, Віні Пух...

***

Звоніць Бэн-Ладэн Арафату.
- Патлумач мне адну рэч... Я – тэрарыст, і ты – тэрарыст. Мае людзі забілі некалькі тысяч нявінных людзей, і твае... Але мяне шукаюць усім светам, за маю галаву прызначана ўзнагарода - а цябе ўсе любяць і нават далі Нобелеўскую прэмію міра. Чаму?!
- А я забіваю толькі габрэяў...

***

Чым больш я пазнаю мытнікаў, тым больш мне падабаюцца даішнікі.

***

Азвярын + Віагра. Помста ката Леапольда была жахлівай.

***

Якой жа разумнай павінна быць жонка, каб муж не сумняваўся, якая яна дура!

***

Муж - жонцы:
- Я прапаную правесці навагоднія святы ў максімальна спакойнай сямейнай абстаноўцы. Як гэта было калісьці...
Жонка заўважае, што ў супруга нават слёзы выступілі з вачэй. Яна пяшчотна абдымае яго.
- Я згодна, дарагі. Давай абмяркуем дэталі.
- Добрая думка. Значыць так: я набуду каўбасы, сыру, бутэлек пяць партвейну, а ты з'ездзіш у госці да сваіх бацькоў.

***

- Я мару зарабляць па 10 тысяч даляраў у месяц, як мой бацька.
- Твой бацька зарабляе 10 тысяч у месяц?!
- Не, але ён таксама аб гэтым марыць!

***

- З-за чаго ты мяне пакахаў?
- З-за вачэй!
- Табе адразу спадабаліся мае вочы?
- Не, па-просту ў мяне зрок дрэнны.

***

"Прадам танна рыбалоўныя прылады і рыбацкую вопратку. Тэл.: 545-31. У выпадку, калі трубку возьме мужчына, трэба сказаць: "Памылка".

***

Па двары прагульваецца брытагаловы граміла ў доўгім паліто. Да яго падыходзіць бабулька:
- Выбачайце, калі ласка! Мая кошка толькі што забіла вашага бультэр'ера!
- Ты чаго лепіш? Як гэта кошка магла бультэр'ера забіць?
- ¨н ёю падавіўся...

***

– Доктар, - кажа асістэнт, - пацыент Сідорскі з другой палаты дрэнна сябе адчувае.
- Трэба казаць: "Пацыент Сідорскі думае, што дрэнна сябе адчувае". Гэта найноўшы погляд на сутнасць хваробы.
На наступны дзень асістэнт падыходзіць да доктара.
- Доктар, пацыент Сідорскі з другой палаты думае, што ён памёр.

***

- А у мяне сябра гінеколагам працуе, вось, зараз яму патэлефаную: «Алё, Андрусь, прывітанне, ты дзе?... Ну, не злуйся, не крычы. Так бы адразу і сказаў, што на працы...».

***

Падбягае садыст да хлопчыка і пачынае яго метадычна збіваць. Садыст:
- Як клічуць?!!
Хлопчык: - Э-Э-Э-А-А-У-У!!!
С: (б'е мацней) - Як клічуць?!!!
Х: (гучней і больш жалосна) - А-А-У-У-Э-Э-О!!!
С: (б'е яшчэ мацней) - Я-к к-л-і-ч-у-ц-ь?!!!!!!
Х: - Сярожа, Сярожа!!! (заліваючыся слязьмі).
С: - Чаму маўчаў?!!!
Х: (скрозь плач) - Глуханямы!

***

Дзве сяброўкі гутараць:
- І як табе мой жаніх?
- Даволі прыстойны, прывабны, адукаваны... Калі б ён яшчэ ў ложку так страшэнна не хрыпеў...

***

2050 год. "Весці":
- Як заявіў Буш-малодшы-малодшы-малодшы... - малодшы, у сувязі з тым, што ў Іраку больш не засталося ніводнага іракца, амерыканская адміністрацыя будзе шукаць іракцаў па ўсім свеце і ўсё-роўна прадаставіць ім свабоду, дэмакратыю і вызваліць іракскі народ ад дыктатуры.

***

Авіяносец вяртаецца ў свой порт пасля доўгага плавання.
Напярэдадні адзін марак дае радыёграму жонцы:
"Шэсць месяцаў без сэкса. У тваіх інтарэсах прыйсці сустракаць мяне прама да трапу".
Прыходзіць адказ:
"Шэсць месяцаў без сэкса. У тваіх інтарэсах сыйсці з трапа першым".

***

- Уяві, адзін мой знаёмы сёння жэніцца на сваёй сястры!
- Але гэта немагчыма!
- Магчыма. ¨н - урач...

***

- Ты чаго гэта нацапіў? Ды ты ведаеш, што за гэты медаль людзі кроў пралівалі.
- А ты мяркуеш, мне дзядуля яе проста так аддаў?!

***

- Ты прыйдзеш на маё вяселле?
- Калі?
- У пятніцу.
- А ты з кім збіраешся ажаніцца?
- З табой...
- А, ну, тады прыйду...

***

Міністэрства абароны РБ вырашыла скараціць штаты. Першым было вырашана скараціць штат Невада.

***

- Калі я скокну ў ваду, ты выратуеш мяне, дарагі?
- А калі я скажу "так", ты скокнеш, дарагая?

***

Ноч, пляж, бераг Мухаўца. Пад дубамі-ёлкамі сядзіць вясёлая кампанія і адзначае закрыццё пляжнага сезона разам з днём народзінаў. Шумгам, шашлыкі-гітара, дым карамыслам... У кустах паймалі вожыка. Далей ідзе дыялог. Першы, трымаючы звярушку і зазіраючы ёй ў твар:
- Ведаеце, хлопцы, па-мойму гэта - дзяўчынка...
Другі, асвятляючы фанарыкам рукі сябра:
- Ты што, зусім ахранеў?! Гэта ж вожык!!!

***

Калі Вы пастаянна спяшаецеся - пейце замест гарбаты тармазную вадкасць.

***

Чым вышэй Расея падымае свой хвост - тым бачней становіцца яе сапраўдны твар!

***

Мужык убачыў у праграме, што ў суботу бокс будзе, суперфінал, суперцяжкая катэгорыя, матч стагоддзя і ўсё такое... Ну, вырашыў ён падрыхтавацца да прагляду, набыў піва, рыбку. Рыбку пачысціў, костачкі вынуў, піва ахладзіў, сеў, значыць, глядзець. Толькі бойка пачалася на 8 секундзе накаут і ўсё - канец бойкі. Мужык нават піва не паспеў глытнуць... Тут жонка з кухні выходзіць і здзекліва так гаворыць: "Ну, цяпер та ты мяне разумееш?!"

***

Тарыф "Ваенны"! Першыя два гады - бясплатна!

***

Размаўляюць хлопец з дзяўчынай:
- Хочаш, пакажу фокус?
- Выхоўваць сам будзеш!

***

- Як вызначыць высокую якасць каўбасы?
- Такую каўбасу не адмаўляецца есці кошка.
- А як даведацца, што каўбаса проста небяспечная для здароўя?
- Такую каўбасу адмаўляецца есці сабака...

№1 ДЗЕДЗІЧ
ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ
люты 2004

ПРЫ ВЫКАРЫСТАННІ МАТЭРЫЯЛАЎ БЮЛЕТЭНЯ СПАСЫЛКІ НА КРЫНІЦУ АБАВЯЗКОВЫЯ
Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў і друкаваць артыкулы для далейшай палемікі

**Заснавальнік:** Ініцыятыўная група моладзі
**Распаўсюджваецца бясплатна** на правах унутранага карыстання
**Падпісана ў друк:** 28.02.2004 у 18[00]
**Наклад:** 299 асобнікаў. Надрукавана на ксераксе.

**Галоўны рэдактар:** Дзмітрый Шыманскі.
**Рэдакцыйная калегія:** А. Дземідзюк, М. Сімановіч, Д. Шастак, М. Есіна, С. Прылуцкі, С. Камінскі.
**Адказны сакратар:** А. Ляўчук. **Вёрстка:** Б. Дэпеша

**Кантактны тэлефон:** (0162) 20-57-41, (029) 660-57-41
**E-mail:** dzedzich@mail.ru